ЧАСОПІС ДЛЯ ВАС

№7 (1006), ЛІПЕНЬ, 2017
Беларусь. Belarus

# БЕЛАРУСЬ

Палітыка, эканоміка, культура

ISSN 0320-7544




# Гасцінна запрашаем, ТУРЫСТ!

INTERNATIONAL

The Minsk Times

Socio-political Weekly

Пра падзеі ў Беларусі і свеце

Штотыднёвік, які чытаюць у арыгінале

Не спазніцеся аформіць падпіску

Індэксы: ведамасны — 637302, індывідуальны — 63730

# ЗМЕСТ




**12 Інтэграцыя скіравана ў заўтрашні дзень** Беларусь і Расія імкнуцца ўмацоўваць міждзяржаўныя стасункі ў самым шырокім сэнсе

**16 Геаграфічная аддаленасць не можа быць перашкодай для дружбы і супрацоўніцтва** У Беларусі з афіцыйным візітам знаходзіўся Прэзідэнт В'етнама Чан Дай Куанг




**20 Як вырошчваюць клеткі. Сваволья**

**22 Калі падысці да справы беражліва і па-наватарску** "Зялёныя праекты" з поспехам рэалізуюцца ў Барысаўскім і Крупскім раёнах Мінскай вобласці

**24 Экалагічныя сцежкі ў загадкавым краі** Унікальны Цэнтр міфалагічнага турызму адкрыўся ў Бярэзінскім запаведніку

**30 Смачныя вандроўкі**

**32 Містыка, дый толькі**

**34 Не за трыдзевяць зямель** Беларусь — скарбніца ўнікальных помнікаў, прыродных цудаў і традыцый, пра якія многія нават не падазраюць

**36 Сінявокая чароўнасць Беларуская Паазер'я** У любым рэгіёне Беларусі можна адшукаць куткі першароднай прыроды — захоўваць іх дапамагае асаблівы статус, якім яны надзелены. Прапануем здзейсніць "паказальную прагулку" па Віцебшчыне

**42 Сіла кітайскага дракона**

**46 Святая прастата, схаваная ў іконе**

**48 На крылах кахання** Уражанні пра сусветную прэм'еру балета "Ор і Ора", якой Вялікі тэатр Беларусі завяршыў 84-ы тэатральны сезон




**Беларусь. Belarus**

Штомесячны часопіс

**№ 7 (1006), ліпень, 2017**
Выдаецца з 1930 года.

**Рэгістрацыйнае пасведчанне нумар 8.**
Выдадзена 2 сакавіка 2009 г. Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:**
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия", ААТ "Белзнешэканамбанк"

**Рэдактар**
Віктар Міхайлавіч Харкоў

**Адказны сакратар**
Валянціна Ждановіч

**Дызайн і вёрстка:**
Вадзім Кандрашоў
Надзея Панкратава

**"Беларусь.Belarus"** выходзіць на беларускай, англійскай, іспанскай, кітайскай і польскай мовах.

Часопіс распаўсюджваецца ў 50 краінах свету.

За дакладнасць фактаў, іх інтэрпрэтацыю адказнасць нясуць аўтары публікацый. Пры выкарыстанні матэрыялаў часопіса спасылка на **"Беларусь. Belarus"** абавязковая. Рэдакцыя не нясе адказнасці за змест рэкламных паведамленняў.

**Выдавец:**
Установа Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "Рэдакцыя газеты "Советская Белоруссия". Вул. Б. Хмяльніцкага, 10ª, 220013, Мінск.

Часопіс надрукаваны ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве "Выдавецтва "Беларускі Дом друку". Паліграфічная ліцэнзія №02330/106 ад 30.04.2004. Пр-т Незалежнасці, 79, г. Мінск, Беларусь, 220013

Падпісана ў друк 19.07.17 г.
Выпуск у свет 25.07.17 г.

Афсетны друк. Папера крэйдаваная. Фармат 60х90 1/8. Друкаваных аркушаў 7. Гарнітура Міньён.

**Заказ № 1853**
**Агульны тыраж** — 2311 экз. (на беларускай мове — 172)

**Адрас рэдакцыі:**
вул. Кісялёва, 11, г. Мінск, Беларусь, 220029.
Тэл.: +375 (17) 290-62-24, +375 (17) 290-66-45.
Тэл./факс: +375 (17) 290-68-31.

**E-mail:** belmag@sb.by
**Падпісны індэкс** — 74820.
**Цана дамоўная.**

© **"Беларусь. Belarus"**, 2017

# Краіна ў сучасным вымярэнні

3 ліпеня ў Беларусі — галоўнае дзяржаўнае свята. Дзень Незалежнасці. Што можа быць больш значнае за гэты Сімвал для маладой суверэннай краіны!

Сімвалічна і тое, што пунктам адліку для свята стаў дзень вызвалення Мінска ад фашыстаў — 3 ліпеня 1944 года.

У гады вайны загінуў кожны трэці жыхар Беларусі. Такая цана свабоды. Мы пра гэта памятаем.

Дарэчы, пасля Другой сусветнай вайны Беларусь стала адной з заснавальніц Арганізацыі Аб'яднаных Нацый. Далёка не кожная дзяржава атрымлівае такое права. На карысць Беларусі — тады адной з рэспублік Савецкага Саюза — такі выбар быў зроблены якраз за вялікі ўклад у разгром фашызму.

І да ветэранаў — стаўленне з удзячнасцю. Пра гэта неабходна абавязкова сказаць на фоне звяржэння пераможных сімвалаў у асобных краінах. У нас павага да гэтых людзей — гэта святое. Таму што ў кожнай сям'і тая вайна пакінула свой след.

Уласна, ці многія сучасныя падлеткі заспелі ў жывых герояў той вайны? Што яны думаюць пра яе? Можна было б прывесці нямала прыкладаў, калі зусім юныя хлопцы і дзяўчаты самазабыўна вялі пошук загінулых у вайну салдат, аднаўлялі імёны невядомых, бралі шэфства над ветэранамі.

Час ідзе, і свет, ці яго канфігурацыя, як гавораць палітыкі, мяняецца. Але сапраўдныя каштоўнасці не падлягаюць перагляду. Беларусь будуе свае ўзаемаадносіны з іншымі краінамі на прынцыпах добрасуседства. Гэта і ёсць яе палітычнае крэда. А перамагаць лепш у конкурсах. Годны шлях выявіць моцнага.



СЯРГЕЙ ЛАЗЮК

Сёння трэба больш партнёрства: паміж людзьмі, паміж краінамі. У гэтым — стратэгічная сутнасць сучаснага міжнароднага супрацоўніцтва. На яе арыентуецца і Беларусь у сваёй знешняй палітыцы. Пра гэта — наша публікацыя **"Мінскія дыскусіі на еўрапейскую тэму".**

Справа ў тым, што ў ліпені ў Мінску прайшоў маштабны палітычны форум — 26-я летняя сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. У Беларусь прыехала каля 700 замежных парламентарыяў і палітыкаў з 56 дзяржаў. У тым ліку старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ Крысцін Мутанен, дзеючы старшыня АБСЕ Себасцьян Курц. Асноўная тэма мінскіх дыскусій — умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне. Парламентарыі абмеркавалі самыя актуальныя і набалелыя тэмы: урэгуляванне канфліктаў у рэгіёне, процідзеянне тэрарызму, міграцыйныя выклікі, правы чалавека, змену клімату, кібербяспеку. Мінск упершыню прымаў у сябе такі форум, нягледзячы на тое што Беларусь ужо чвэрць стагоддзя з'яўляецца паўнапраўным членам АБСЕ і яе актыўным удзельнікам. Выбар краіны ў якасці пляцоўкі для дыялогу стаў вынікам спалучэння шматлікіх фактараў. Геапалітычная сітуацыя ў рэгіёне сур'ёзна мяняецца, напружанне нарастае. У гэтых умовах Беларусь па-ранейшаму застаецца донарам стабільнасці, уносіць важкі ўклад у забеспячэнне еўрапейскай бяспекі. Узважаная знешняя палітыка краіны, гатоўнасць да дыялогу не застаюцца незаўважанымі. Сусветная супольнасць усё больш усведамляе важнасць і значнасць краіны як надзейнага і бяспечнага сувязнага звяна паміж Захадам і Усходам. Вядома, што структура АБСЕ была створана яшчэ ў 70-я гады як адказ на абвастрэнне халоднай вайны. Сёння гэта буйнейшая міжнародная арганізацыя, якая ахоплівае тры кантыненты і больш як мільярд чалавек. Першапачаткова на яе ўскладаліся задачы па прадухіленні канфліктаў у рэгіёне і ўрэгуляванні крызісных сітуацый. Аднак з цягам часу стала відавочна, што АБСЕ не спраўляецца са сваімі функцыямі. Аляксандр Лукашэнка назваў вельмі неабходнай сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў АБСЕ для абмеркавання вельмі важных і сур'ёзных праблем. Крыху пазней, выступаючы на пленарным пасяджэнні сесіі, Прэзідэнт Беларусі ўнёс канкрэтную прапанову: пачаць у фармаце АБСЕ дыскусію аб неабходнасці арганізацыі новага Хельсінкскага працэсу. Гэтая ідэя знайшла падтрымку ў парламентарыяў.

Такім чынам, усе падрабязнасці пра форум у матэрыяле **"Мінскія дыскусіі на еўрапейскую тэму".**

Так, Беларусь становіцца ўсё больш вядомай. І не толькі па прычыне сваёй актыўнасці ў знешняй палітыцы. Краіна гасцінна адкрывае дзверы для тых, хто жадае пазнаёміцца з ёй бліжэй. Гэтаму аспекту прысвечаны цэлы блок матэрыялаў у цяперашнім выпуску. Іх агульную сутнасць выяўляюць словы, вынесеныя на вокладку часопіса: **"Гасцінна запрашаем, турыст!"** У публікацыях, упэўнены, знойдзецца нямала цікавага і пазнавальнага пра турыстычную прывабнасць сучаснай Беларусі з яе багатай гісторыяй і традыцыямі.

**ВІКТАР ХАРКОЎ**



БЕЛТА

# Урачысты сход як пралог свята

**Чырвона-зялёныя сцягі ды кампазіцыі на Кастрычніцкай плошчы, прыгожа апранутыя людзі і ажыўлена-вясёлы шум Палаца Рэспублікі. Менавіта такі антураж папярэднічаў пратакольнаму, на першы погляд, але, па сутнасці, гістарычнаму і лёсавызначальнаму мерапрыемству ў цэнтры Мінска.**

Урачысты сход, прысвечаны Дню Незалежнасці Беларусі, сабраў лепшых людзей нашай краіны. Ветэранаў працы і ваенных. Умудроных вопытам і ўвенчаных сівізной спецыялістаў розных сфер ды таленавітую моладзь, якая прыйшла ім на змену. Тых, хто стаяў ля вытокаў нашага суверэнітэту. І тых, хто падхапіў іх сцяг і ўпэўнена трымае яго ў сваіх руках.

Аляксандр Лукашэнка агучыў па сутнасці стратэгічныя тэзісы, абумоўленыя сучаснай геапалітычнай абстаноўкай:

— Мы робім усё, каб наша армія стала яшчэ больш сучаснай і моцнай. На роўных размаўляюць толькі з тымі дзяржавамі, якія здольныя за сябе пастаяць. Гэта даказана нашай гісторыяй. Менавіта таму мы ўсімі сіламі будзем берагчы і абараняць суверэнітэт і тэрытарыяльную цэласнасць беларускай дзяржавы.

На ўрачыстым сходзе было яшчэ раз падкрэслена:

— Галоўная наша каштоўнасць — народ. Менавіта таму дзяржаўная палітыка падпарадкавана прынцыпу: усё на карысць чалавека. Гэта — кіраўніцтва да дзеяння для ўсіх органаў улады. Таму што рэспубліка з'яўляецца сапраўды народнай.

Няма сэнсу пераказваць усю прамову. Гаварылася пра многае: і пра адраджэнне чарнобыльскіх рэгіёнаў, і пра маючую адбыцца сесію Парламенцкай асамблеі АБСЕ ў Мінску, і пра перагаворы кіраўнікоў Беларусі і Расіі ў Маскве. Адзначым іншае: Аляксандр Лукашэнка пацвердзіў, што ў краіне зроблена стаўка на эканоміку ведаў, роля якой у сучасным свеце каласальна ўзрасла:

— Наша амбіцыйная, але дасягальная мэта — стварыць IT-краіну. Вырашэнне гэтай задачы дазволіць нам зрабіць Беларусь яшчэ больш сучаснай і квітнеючай, а беларусам — з упэўненасцю глядзець у будучыню.

Але, бадай, самае галоўнае з вуснаў Прэзідэнта прагучала крыху пазней. І выклікала авацыю ў зале:

— Прайшоўшы праз выпрабаванні, беларусы заслужылі права жыць на вольнай зямлі, у міры і дастатку, быць паўнапраўнымі ўдзельнікамі сусветных працэсаў. Давайце ж разам, аб'яднаўшы сілы, умацоўваць гэты жыватворны край, падораны нам Госпадам. Бо гэта наш лёс, сучаснасць і будучыня нашых дзяцей і ўнукаў!


БЕЛТА



АРТУР ПРУПАС





# ДЗЕНЬ НЕЗАЛЕЖНАСЦІ ПРАЙШОЎ ЗАПАМІНАЛЬНА

## 3 ліпеня традыцыйна адзначаецца галоўнае свята беларускай дзяржаўнасці

Рашэнне аб святкаванні Дня Незалежнасці 3 ліпеня было прынята ў 1996 годзе — так прагаласавалі беларусы на рэспубліканскім рэферэндуме 24 лістапада. У снежні таго ж года дэкрэтам Прэзідэнта Аляксандра Лукашэнкі ўстаноўлена дзяржаўнае свята — Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі). Яно адзначаецца ў дзень вызвалення Мінска ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў — 3 ліпеня 1944 года. Упершыню Беларусь адзначыла Дзень Незалежнасці ў 1997 годзе.

Беларусі першай давялося прыняць на сябе ўдары гітлераўскіх полчышчаў, а Мінск на другі дзень вайны трапіў пад бязлітасную бамбардзіроўку і артылерыйскі абстрэл. На подступах да горада гітлераўцы сустрэлі ўпартае супраціўленне. Асабліва мужна ваявалі з ворагам 100-я і 64-я стралковыя дывізіі. Але 28 чэрвеня фашыстам удалося авалодаць Мінскам. З першых дзён акупацыі жыхары горада падняліся на барацьбу з ворагам. 1100 дзён акупацыі — 1100 дзён самаадданай, гераічнай барацьбы з гітлераўскімі захопнікамі. Мінск быў акупаваны, але не пакораны.

У выніку бліскучай Беларускай аперацыі пры ўзаемадзеянні 1-га і 3-га Беларускіх франтоў і пры падтрымцы партызан 3 ліпеня 1944 года сталіца Беларусі была вызвалена ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэты дзень стаў святам вызвалення ўсёй краіны. У Беларусі ведаюць цану свабодзе: у Вялікай Айчыннай вайне за яе загінуў кожны трэці жыхар рэспублікі.

Традыцыйна 3 ліпеня беларускі народ аддае даніну павагі гераізму ды стойкасці салдат, самаадданай барацьбе падпольшчыкаў і партызан, беспрыкладнаму працоўнаму подзвігу тых, хто паднімаў краіну з руін.







АЛЯКСАНДР КУШНЕР

# Магутнае ўражанне ад відовішчнага маршу

**Ваенны парад войскаў Мінскага гарнізона і праходжанне тэхнікі грамадзянскага прызначэння ў гонар Дня Незалежнасці адбыліся ў сталіцы Беларусі**

Усяго ў парадзе было задзейнічана каля 3,5 тысячы ваеннаслужачых. У складзе пешай калоны прынялі ўдзел 20 парадных разлікаў, якія былі прадстаўлены ў тым ліку Мінскім сувораўскім ваенным вучылішчам, Ваеннай акадэміяй, ваенна-тэхнічным факультэтам БНТУ, зводнымі падраздзяленнямі воінскіх часцей.

У складзе механізаванай калоны ўдзельнічалі 26 парадных разлікаў сучаснай баявой тэхнікі. Усяго было задзейнічана 222 адзінкі тэхнікі. У складзе механізаванай калоны танкі Т-72Б, баявыя машыны пяхоты БМП-2, бронетранспарцёры БТР-80, аўтамабілі “Волат”, лёгкабраніраваныя аўтамабілі “Кайман”, аўтамабілі МЗКЦ з беспілотнымі авіяцыйнымі комплексамі, станцыі Р-434, мінамётныя комплексы “Сані”, баявыя машыны “Штурм”, рэактыўная сістэма залпавага агню “Паланэз” ды іншая баявая тэхніка.

У складзе паветранага эшалона ў парадзе прынялі ўдзел 58 паветраных суднаў: 26 верталётаў і 32 самалёты.

Калона грамадзянскай тэхнікі была прадстаўлена 102 адзінкамі. У іх ліку —легкавыя аўтамабілі “БелДжы”, тэхніка Мінскага трактарнага завода, холдынгаў “Гомсельмаш”, “Амкадор”.

## Міралюбныя прынцыпы выклікаюць павагу

**Беларусь выступае за вырашэнне любых міжнародных канфліктаў выключна за сталом перагавораў. Пра гэта заявіў Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка, выступаючы 3 ліпеня на парадзе ў гонар Дня Незалежнасці**

“Мы ганарымся тым, што Беларусь адбылася як незалежная дзяржава, якая праводзіць міралюбную шматвектарную знешнюю палітыку. Наш нязменны прынцып: роўнасць усіх краін ды іх неўмяшанне ва ўнутраныя справы адна адной. Мы выступаем за вырашэнне любых міжнародных канфліктаў выключна за сталом перагавораў”, — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

“На жаль, іншыя краіны не пажадалі пераняць гэты прыклад, — канстатаваў Прэзідэнт Беларусі. — Да чаго гэта прывяло? Ідзе нарастанне глабальнай нестабільнасці. Міжнародная бяспека парушана. На шлях мілітарызацыі ўступілі краіны Еўропы. Яны ўцягваюцца ў гонку ўзбраенняў і ваенныя прыгатаванні. ЗША разгортваюць тут, ля нашых межаў, сістэму супрацьракетнай абароны і ўдасканальваюць свой ядзерны патэнцыял”.

“Наш адказ — сучасная беларуская армія. Яна пастаянна мадэрнізуецца, мабільная, навучаная і ўзброеная”, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

# Брама памяці на месцы трагедыі

## У гады вайны пад Мінскам знаходзіўся адзін з самых вялікіх у Еўропе лагераў смерці Трасцянец

Два гады назад на месцы трагедыі сціплыя абеліскі дапоўнілі 10-метровай бронзавай кампазіцыяй “Брама Памяці” — фігурамі знясіленых вязняў, літаральна ўрэзанымі ў створкі лагерных варот. Як ствараўся манумент, нашаму карэспандэнту расказаў яго аўтар — скульптар Канстанцін Касцючэнка.

— Брама — гэта знак пераходу. У Трасцянец можна было ўвайсці, але ўцячы з лагера смерці ўдалося адзінкам. Манумент — даніна памяці ахвярам канцлагераў. На ім адлюстраваны людзі, якія зведалі нечалавечыя пакуты. Мне хацелася б, каб скульптура прымусіла кожнага чалавека спыніцца хоць бы на хвіліну і задумацца аб трагедыі вайны. У кампазіцыі няма ўзвышшаў і прыступак. Ад іх я адмовіўся адмыслова, каб кожны мог дакрануцца да варот, прайсці праз іх і адчуць жах і безвыходнасць, якія тут панавалі ў тыя гады.

***— Ваш манумент — самая высокая бронзавая скульптура ў Беларусі. Што было самым складаным пры яе стварэнні?***

— Многія раілі зрабіць створкі варот у два разы меншымі. Але я настаяў на дзесяціметровым варыянце. Скульптура адлюстроўвае маштаб страшнай трагедыі, а так яна проста згубілася б у вялікай адкрытай прасторы. Тры месяцы мы з калегамі ў экстрэмальных зімовых умовах з раніцы да ночы ляпілі манумент з гліны. Даводзілася ўключаць цеплавыя пушкі, каб гліна і мы не змерзлі. На ўзвядзенне вялізнай скульптуры вышынёй з чатырохпавярховы дом пайшло 32 тоны гліны і амаль столькі ж бронзы.



БЕЛТА

**Факты**

**Трасцянец — адзін з самых вялікіх лагераў смерці ў Еўропе. Займае чацвёртае месца па колькасці ахвяр пасля Асвенцыма, Майданэка і Трэблінкі. На яго тэрыторыі фашысты забілі больш за дзвесце тысяч чалавек з Беларусі, Расіі, Украіны, Польшчы, Аўстрыі, Германіі, Чэхаславакіі, Францыі. Мемарыяльны комплекс “Трасцянец” аб’ядноўвае некалькі месцаў, дзе знішчалі людзей: вёска Малы Трасцянец, дзе ўтрымліваліся вязні, урочышча Шашкоўка — месца спалення вязняў і ўрочышча Благаўшчына — месца масавага расстрэлу. Стварэнне мемарыяльнага комплексу на месцы трагедыі вялося пад патранатам Аляксандра Лукашэнкі.**



## Дасье

■ **Канстанцін Аляксандравіч Касцючэнка — скульптар, дацэнт кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў.**

**Вучыўся ў Акадэміі выяўленчых мастацтваў у Фларэнцыі. Уладальнік прэстыжных міжнародных і нацыянальных прэмій і ўзнагарод у галіне скульптуры. Лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь за стварэнне манумента "Брама Памяці" мемарыяльнага комплексу "Трасцянец". Суаўтар помніка-бюста кампазітару Станіславу Манюшку, які ўсталяваны на яго радзіме ў Чэрвені.**

**Прадстаўляў Беларусь на Венецыянскім біенале ў 2011 годзе. Яго працы выстаўлены ў айчынных музеях сучаснага мастацтва і ў прыватных калекцыях Францыі, Бельгіі, Аўстрыі, Італіі.**



ВІТАЛІЙ ГІЛЬ

***— Адкуль з'явіўся вобраз, які мы сёння бачым?***

— Ствараць эскіз пачаў у 2007 годзе. Да работы рыхтаваўся дасканала: перачытваў ваенныя кнігі, вывучаў архіўныя дакументы, пабываў на іншых мемарыяльных комплексах. З 20 прац мой праект выбралі сем гадоў назад на адкрытым рэспубліканскім конкурсе.

***— Хто вашы настаўнікі?***

— Пасля заканчэння Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў працаваў у творчых майстэрнях жывапісу, графікі і скульптуры, якія ўзначальваў народны мастак Міхаіл Савіцкі. Шмат чаму навучыўся ў легендарнага скульптара Льва Гумілеўскага. Калі вырашыў удзельнічаць у конкурсе, мне многія гаварылі, што я яшчэ малады для такой складанай тэмы. Але я быў упэўнены ў сабе. У стварэнні вобразаў мне дапамаглі ўспаміны Міхаіла Савіцкага. Аўтар знакамітага палатна "Партызанская мадонна" прайшоў праз жахі канцлагераў Дзюсельдорфа, Бухенвальда і Дахау. Не раз чуў, як маю працу называлі змрочнай, пужлівай. Але чаму яна павінна быць прыгожай? Манумент стаіць на зямлі, залітай крывёю, і мая скульптура літаральна крычыць аб гэтым. А яшчэ мы з галоўным архітэктарам праекта Ганнай Аксёнавай вырашылі не рабіць лішніх прыбудоў, таму перад помнікам проста ляжаць гранітныя пліты, а побач — роўны газон. Навошта трывожыць рэшткі людзей, пахаваных у гэтай брацкай магіле на гэтым вялізным полі.

***— У вашым родзе хто-небудзь ваяваў?***

— На фронце змагаліся з ворагам абодва дзяды. На жаль, сёння іх ужо няма ў жывых. Ведаю, што яны больш за ўсё хацелі, каб дзеці, унукі, праўнукі ніколі не перажылі кашмараў ваенных гадоў. Дзед па бацькавай лініі бачыў маю працу. Брама яго ўразіла, ён гаварыў, што ганарыцца мною.

Крысціна **Хілько**

# Мінскія дыскусіі на еўрапейскую тэму

**У Мінску прайшоў маштабны палітычны форум — 26-я летняя сесія Парламенцкай асамблеі Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. У Беларусь прыехала каля 700 замежных парламентарыяў і палітыкаў з 56 дзяржаў. У тым ліку старшыня Парламенцкай асамблеі АБСЕ Крысцін Мутанен, дзеючы старшыня АБСЕ Себасцьян Курц, іншыя вядомыя еўрапейскія палітыкі.**

Асноўная тэма мінскіх дыскусій — умацаванне ўзаемнага даверу і супрацоўніцтва ў імя міру і працвітання ў рэгіёне. Парламентарыі абмеркавалі самыя актуальныя і набалелыя тэмы: урэгуляванне канфліктаў у рэгіёне, процідзеянне тэрарызму, міграцыйныя выклікі, правы чалавека, змену клімату, кібербяспеку. Мінск упершыню прымаў у сябе такі форум, нягледзячы на тое што Беларусь ужо чвэрць стагоддзя з'яўляецца паўнапраўным членам АБСЕ і яе актыўным удзельнікам. Выбар краіны ў якасці пляцоўкі для дыялогу стаў вынікам спалучэння многіх фактараў. Але перш за ўсё гэта сведчанне ўзрастаючага аўтарытэту Беларусі і беларускага Парламента на міжнароднай арэне. Геапалітычная сітуацыя ў рэгіёне сур'ёзна мяняецца, напружанне нарастае. У гэтых умовах Беларусь па-ранейшаму застаецца донарам стабільнасці, уносіць важкі ўклад у забеспячэнне еўрапейскай бяспекі. Узважаная міралюбівая знешняя палітыка краіны, гатоўнасць да адкрытага дыялогу не застаюцца незаўважанымі. Сусветная супольнасць усё больш усведамляе важнасць і значнасць нашай краіны як надзейнага і бяспечнага сувязнага звяна паміж Захадам і Усходам. Гэтая думка не раз гучала на пленарным пасяджэнні сесіі з удзелам Прэзідэнта Беларусі. Па сутнасці, Аляксандр Лукашэнка задаў тон усёй рабоце сесіі, выступіўшы з важнымі заявамі ды ініцыятывамі. Да пачатку форуму Прэзідэнт сустрэўся з кіраўніцтвам ПА АБСЕ. На пленарным пасяджэнні, прысвечаным урачыстаму адкрыццю 26-й штогадовай сесіі ПА АБСЕ, Прэзідэнт выступіў з прамовай.

*Беларусь па-ранейшаму застаецца донарам стабільнасці, уносіць важкі ўклад у забеспячэнне еўрапейскай бяспекі. Узважаная міралюбівая знешняя палітыка краіны, гатоўнасць да адкрытага дыялогу не застаюцца незаўважанымі. Сусветная супольнасць усё больш усведамляе важнасць і значнасць нашай краіны як надзейнага і бяспечнага сувязнага звяна паміж Захадам і Усходам*

Структура АБСЕ была створана яшчэ ў 70-я гады як адказ на абвастрэнне халоднай вайны. Сёння гэта буйнейшая міжнародная арганізацыя, якая ахоплівае тры кантыненты і больш за мільярд чалавек. Першапачаткова на яе ўскладаліся задачы па прадухіленні канфліктаў у рэгіёне і ўрэгуляванні крызісных сітуацый. Аднак з цягам часу стала відавочна, што АБСЕ не спраўляецца са сваімі функцыямі. І Прэзідэнт Беларусі адкрыта гаварыў пра гэта са старшынёй Парламенцкай асамблеі АБСЕ Крысцін Мутанен. Вось яго словы:

— Паглядзіце, колькі негатыўнага адбылося за апошні час у Еўропе. І якая рэакцыя наша, кіраўнікоў дзяржаў? Ніякай. Вайна ідзе ў Еўропе — ніякай рэакцыі. Гэта гаворыць пра



БЕЛТА

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка прыняў удзел у рабоце мінскага форуму

тое, што ў арганізацыі ёсць праблемы. Іх трэба вырашаць у пачатку, як і хваробу трэба лячыць у самым пачатку. Калі мы запускаем гэты працэс, вы ведаеце, да чаго гэта прыводзіць. Сёння ўсё больш і больш паўстае пытанне аб рэфармаванні АБСЕ, каб зрабіць яе больш дзейснай, рашучай.

Аляксандр Лукашэнка назваў вельмі неабходнай сустрэчу кіраўнікоў дзяржаў АБСЕ для абмеркавання вельмі важных і сур'ёзных праблем. Са свайго боку Прэзідэнт гарантаваў усялякую падтрымку такому дыялогу:

— Нашы магчымасці вы добра ведаеце. Вы на нас можаце заўсёды разлічваць, асабліва што датычыцца донарства бяспекі ў нашым еўрапейскім рэгіёне. Нам трэба па-еўрапейску, цывілізавана наводзіць парадак.

Гэта датычыцца не толькі такіх глабальных праблем, як тэрарызм і некантралюемая міграцыя. Усё большую небяспеку ўяўляюць транзіт наркотыкаў, гандаль людзьмі, нелегальнае перамяшчэнне радыеактыўных элементаў і многае іншае.

Крыху пазней, выступаючы на пленарным пасяджэнні сесіі, Прэзідэнт унёс канкрэтную прапанову: пачаць у фармаце АБСЕ дыскусію аб неабходнасці арганізацыі новага Хельсінкскага працэсу. Гэтая ідэя знайшла падтрымку ў парламентарыяў. Вось што сказаў наконт гэтага старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі Уладзімір Андрэйчанка:

— Толькі адкрыты і раўнапраўны дыялог дапаможа развязаць тугі клубок міжнародных праблем і даць людзям тое, у чым яны маюць патрэбу перш за ўсё: мірнае неба, стабільнасць і дабрабыт. Мы чакаем канструктыўнага абмену меркаваннямі і, галоўнае, адмовы ад канфрантацыйнага мыслення. Парламенцкая дыпламатыя павінна быць задзейнічана для навядзення мастоў, разбурэння стэрэатыпаў, пошуку ўзаемапрымальных кампрамісаў. Трэба адкінуць амбіцыі, засяродзіўшы намаганні на аб'яднанні і супрацоўніцтве.

У першы ж дзень работы форуму Прэзідэнт Беларусі таксама сустрэўся з міністрам замежных спраў Аўстрыі, дзеючым старшынёй АБСЕ Себасцьянам Курцам. Аляксандр Лукашэнка адзначыў важкі ўклад аўстрыйскага палітыка ў паляпшэнне адносін паміж Беларуссю і Аўстрыяй. У сваю чаргу Себасцьян Курц падзякаваў Прэзідэнту за магчымасць сустрэцца на палях форуму.

— Я лічу вельмі важным пазітыўным сігналам тое, што пасяджэнне Парламенцкай асамблеі АБСЕ праходзіць у Мінску. І я, вядома ж, вельмі рад пагаварыць пра двухбаковыя адносіны паміж Беларуссю і Аўстрыяй, абмеркаваць праблематыку АБСЕ, дзе, на жаль, вельмі шмат праблем.

Дыскусіі ў Мінску доўжыліся некалькі дзён. Па выніках сесіі былі прыняты рэзалюцыі, якія леглі ў аснову Мінскай дэкларацыі. У ёй парламентарыі сфармулявалі рэкамендацыі для нацыянальных урадаў, парламентаў і міжнароднай супольнасці па рэагаванні на актуальныя выклікі і пагрозы.

Васіль **Харытонаў**

# Гавораць удзельнікі

**Крысцін Мутанен, старшыня Парламенцкай Асамблеі АБСЕ:**



— Беларусь займае асаблівае месца ў Еўропе як геаграфічна, так і палітычна. Мінск прызнаецца як месца работы міжнароднай дыпламатыі і ўрэгулявання канфліктаў. Па сутнасці, Мінск — гэта сінонім намаганняў па дасягненні міру ў Нагорным Карабаху, Украіне. Мы пастаянна падтрымліваем мінскія пагадненні і заклікаем да іх поўнага выканання.

Прэзідэнт Лукашэнка гаварыў пра забеспячэнне даверу ў духу Хельсінкі. Менавіта ў гэтым духу мы павінны дзейнічаць, калі хочам адысці ад краю, ад недаверу, якія характарызуюць цяперашнюю сітуацыю. Мы бачым вельмі шмат праяў таго, што рухаемся ў няправільным напрамку. Ці гэта праблема ксенафобіі, фрагментацыя Еўропы, ці нарастанне разлому паміж Усходам і Захадам, зацяжныя канфлікты. Усё гэта прымушае нас, палітыкаў, спыніць гэты рух і накіраваць яго ў правільнае рэчышча.

**Себасцьян Курц, дзеючы старшыня АБСЕ, федэральны міністр па пытаннях Еўропы, інтэграцыі і замежных спраў Аўстрыі:**



— Я вельмі ўдзячны за тое, што Мінск сапраўды наладжвае масты паміж Усходам і Захадам і стаў месцам правядзення дыялогу. На жаль, блокавае мысленне, якое павінна было адысці ў мінулае, вяртаецца на кантынент. Адбываецца радыкалізацыя ўнутры нашых грамадстваў. Вось чаму нам трэба зрабіць усё магчымае для развіцця розных формаў узаемадзеяння, гатоўнасці да кампрамісу. Мы павінны выкарыстаць гэты момант, каб вывесці нашу арганізацыю на новы ўзровень, аднавіць давер паміж краінамі.




БЕЛТА

**Кент Харстэд, намеснік старшыні Парламенцкай асамблеі АБСЕ:**



— Я адзін з тых, хто прасоўваў і падтрымліваў ідэю правядзення сесіі ў Мінску. Гэта вельмі важна для Беларусі як для краіны. Гэта вялікая дэмакратычная падзея з удзелам больш як трох сотняў парламентарыяў і прадстаўнікоў больш як 57 дзяржаў. І, магчыма, гэта адно з самых буйных мерапрыемстваў такога ўзроўню, якія калі-небудзь праводзіла Беларусь. І, вядома, гэта ўплывае на вашу краіну. Не толькі падрыхтоўка і ўсе астатнія мерапрыемствы, якія пройдуць у бліжэйшыя дні, але і тое, што будзе потым. Бо многія людзі, якія цяпер прыбываюць у Беларусь, тут упершыню. І я ўпэўнены, што іх сустрэнуць вельмі гасцінна і яны паедуць з добрымі ўражаннямі ад вашай краіны. Я сам прыязджаў у Беларусь многа-многа разоў. І гэта заўсёды задавальненне быць тут. І мне тут вельмі падабаецца.

**Баляслаў Пірштук, намеснік старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу:**



— Нам важна, каб дэпутаты, нашы калегі, самі пераканаліся, што такое Беларусь. Пагутарылі з людзьмі, пераканаліся, што гэта еўрапейская краіна з еўрапейскай культурай і з вельмі высокім узроўнем развіцця. І я ўпэўнены, што пераважная большасць кардынальна зменіць свае адносіны да Рэспублікі Беларусь.

# і госці форуму




**Іван Браёвіч, старшыня парламента Чарнагорыі:**



— Паміж Беларуссю і Чарнагорыяй ёсць шмат агульнага. Мы таксама выступаем за падтрыманне міру ў рэгіёне. Гэта вельмі важна. Але нам неабходна пачаць больш інтэнсіўнае супрацоўніцтва, нашы адносіны маюць глыбокі патэнцыял.

**Андрэй Рыбак, член дэлегацыі Рэспублікі Беларусь на 26-й сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ:**



— У парадку дня сесіі розныя пытанні, ад палітычных да эканамічных. Гэта і аналіз сітуацыі ў розных рэгіёнах краін — удзельніц АБСЕ, і развіццё зялёнай эканомікі, і шмат іншых пытанняў, якія сапраўды вельмі моцна ўплываюць на бяспеку краін АБСЕ.

**Філіпа Ламбардзі, намеснік старшыні камісіі па палітычных пытаннях парламента Швейцарыі:**



— Вельмі важна, што Мінск стаў пляцоўкай такога форуму. Я цаню гэтую ролю, якую Беларусь адыгрывае ва ўстанаўленні міру ў Еўропе, паколькі яна часцяком выступае ў ролі пасрэдніка ў вырашэнні важных пытанняў і канфліктаў. І я спадзяюся, што гэтая роля будзе расці. Швейцарыя і далей будзе аказваць падтрымку Беларусі ва ўсіх пачынаннях. Мы спадзяёмся, што наша супрацоўніцтва будзе толькі нарастаць.

**Стывен дэ Бор, пасол Канады ў Польшчы і па сумяшчальніцтве ў Беларусі:**



— Адна з прычын актыўнага аднаўлення нашых дыпламатычных сувязяў — канструктыўная пазіцыя Беларусі ў АБСЕ. Мы з энтузіязмам глядзім на тое, што робіць Беларусь увесь гэты час, і вельмі цэнім работу беларускага боку ў мінскім працэсе. Гэта вельмі плённы шлях. Канада таксама падтрымлівае дзейнасць вашай краіны ў пытанні барацьбы з гандлем людзьмі. Беларусь заклікала да правядзення ў верасні сустрэчы высокага ўзроўню па гэтай праблеме, і мы ўдзячныя за пастаянную актуалізацыю гэтага пытання.

**Ёхан Вадэфуль, намеснік кіраўніка германска-беларускай парламенцкай групы бундэстага:**



— Выбар Мінска для правядзення сесіі Парламенцкай асамблеі АБСЕ — гэта своеасаблівы сігнал у зацікаўленасці ў працягу дыялогу і пашырэнні супрацоўніцтва. У эканоміцы яно павінна стаць больш інтэнсіўным, мы зацікаўленыя, каб нямецкія фірмы інвеставалі ў Беларусь. У вас добра адукаваныя спецыялісты. Інвестары — асцярожныя людзі, таму трэба працягваць працаваць над стварэннем спрыяльных умоў, а патэнцыял для росту ёсць. Гэта можа быць і навуковы абмен. У Германіі, як вядома, не самыя нізкія падаткі, але ў нас добрыя тэхналогіі. І не ўсе вытворчасці размяшчаюцца непасрэдна ў Германіі, нам патрэбныя вытворчыя пляцоўкі. Для гэтага неабходныя стабільнасць і ўзаемны давер. І парламенцкія кантакты вельмі важныя.




Падчас сустрэчы ў Маскве

# Інтэграцыя скіравана ў заўтрашні дзень

## Беларусь і Расія імкнуцца ўмацоўваць міждзяржаўныя стасункі ў самым шырокім сэнсе

Анансаваны раней рабочы візіт Прэзідэнта Беларусі ў Маскву пачынаўся сустрэчай Аляксандра Лукашэнкі з кіраўнікамі буйнейшых расійскіх СМІ ў Клубе галоўных рэдактараў ТАСС. Асноўная ўвага на сустрэчы, што зразумела, была прысвечана тэме беларуска-расійскіх адносін: грамадска-палітычнаму і гандлёва-эканамічнаму супрацоўніцтву, узаемадзеянню на інтэграцыйных пляцоўках. Таксама абмяркоўваліся перспектывы развіцця Садружнасці Незалежных Дзяржаў, правілы работы ў Еўразійскім эканамічным саюзе. Галоўныя рэдактары цікавіліся дэталямі беларуска-кітайскага дыялогу, узаемаадносін Мінска і Захаду, праблематыкай украінскага канфлікту, іншымі тэмамі, якія прыцягваюць сёння грамадскую ўвагу. Размова атрымалася вельмі дынамічнай і змястоўнай, стаўшы своеасаблівым пралогам да вельмі насычанага другога дня візіту. У гэты дзень прэзідэнты Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін прынялі ўдзел у пасяджэнні Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, а раней правялі асабістую сустрэчу і выступілі на пленарным пасяджэнні чацвёртага Форуму рэгіёнаў дзвюх краін.

...Да прыбыцця прэзідэнтаў у ЦВК "Экспацэнтр" форум там працаваў ужо больш за суткі. Прайшла чарга перагавораў прадстаўнікоў розных прадпрыемстваў дзвюх краін, іх прэзентацыі, работа ў тэматычных секцыях. Сталі вядомыя і папярэднія вынікі. Сума заключаных кантрактаў да сярэдзіны дня 30 чэрвеня паднялася да 450 мільёнаў долараў. Але канчатковы вынік, трэба меркаваць, будзе яшчэ больш важкі.

У сваіх выступленнях перад удзельнікамі форуму прэзідэнты аднназначна канстатавалі карыснасць беларуска-расійскіх інтэграцыйных працэсаў у цэлым, заклікалі да аб'яднання намаганняў у справе пабудовы

разумнай эканомікі заўтрашняга дня прынцыпова новага ўкладу. Уладзімір Пуцін пра сучаснасць і будучыню ўзаемадзеяння дзвюх краін сказаў так:

— Нашы краіны — стратэгічныя партнёры ў поўным сэнсе гэтага слова і самыя блізкія саюзнікі. На трывалым падмурку дружбы і добрасуседства мы паступальна развіваем двухбаковыя адносіны практычна па ўсіх напрамках. Наш прыклад стымулюе работу з калегамі ў СНД, ЕАЭС, АДКБ. Разам нам удалося выбудаваць эфектыўную структуру кааперацыі, што стварае надзейную базу для нарошчвання дзелавой актыўнасці. Сёння літаральна на вачах фарміруецца новы прамысловы ўклад, заснаваны на актыўным укараненні лічбавых тэхналогій, інавацыйных магчымасцяў нашых дзяржаў. У выніку значныя выгоды атрымліваюць эканомікі Беларусі і Расіі.

Міжрэгіянальнае супрацоўніцтва ў гэтых працэсах адыгрывае шмат у чым вызначальную ролю. Верхнія палаты беларускага і расійскага парламентаў, арганізуючы форумы рэгіёнаў, робяць вялікую справу. А тэма цяперашняга мерапрыемства стала асабліва актуальнай. Аляксандр Лукашэнка звярнуў асаблівую ўвагу на тое, што сёння вельмі важна ў інавацыйным развіцці не адстаць. Інакш даганяць лідараў будзе вельмі няпроста. А гэта страта канкурэнтаздольнасці, чаго дазволіць ні ў якім разе нельга. Па вялікім рахунку, пытанне завастраецца да ступені выжывання ў глабальным свеце. І гэта зусім не перабольшанне.

***Галоўны вынік работы ў тым, што мы пацвердзілі гатоўнасць працягваць канструктыўны дыялог, вырашаць самыя вострыя пытанні па ўсіх напрамках супрацоўніцтва***

матэрыялаў, рабатызацыі, зялёнай энергетыкі. Ад таго, як мы зможам разам адказаць на гэтыя тэхналагічныя выклікі, будзе залежаць доўгатэрміновая канкурэнтаздольнасць нашых краін. Іх пазіцыі ў глабальным падзеле працы. Скажу больш. Ад таго, як мы вырашым гэтую задачу, будзе залежаць у значнай ступені наш лёс. Падкрэслю: Расія гатовая да самага цеснага супрацоўніцтва з партнёрамі з Беларусі для забеспячэння ўстойлівага, доўгатэрміновага росту нашых эканомік.

Аляксандр Лукашэнка таксама даў высокую ацэнку зробленаму за 20 гадоў існавання саюза Беларусі і Расіі. Прынамсі, ні адна дзяржава свету настолькі не рушыла наперад у справе інтэграцыі, наколькі дзве краіны. Прэзідэнт Беларусі падагульніў:

— Вытворчая кааперацыя і рэалізуемыя саюзныя праграмы сведчаць пра эфектыўнасць аб’яднання матэрыяльных ды інтэлектуальных

Тэзісы для Беларусі не гучаць наватарскімі. Невыпадкова гэты год аб’яўлены Годам навукі. А пачаўся ён з зацвярджэння дзяржаўнай праграмы інавацыйнага развіцця краіны да 2020 года. Больш за тое, мы ставім перад сабою амбіцыйную задачу стварэння IT-краіны. Для гэтага ў хуткім часе будзе прыняты пакет неабходных заканадаўчых актаў. Так што да будаўніцтва “разумнай эканомікі” рухаемся ўсвядомлена і паступальна. Але ў любым выпадку аб’яднанне тут намаганняў з бліжэйшымі партнёрамі пойдзе толькі на карысць.

Аляксандр Лукашэнка заклікаў партнёраў да глыбокай кааперацыі, арыентаванай на выпуск высокатэхналагічнай, навукаёмістай прадукцыі. А правядзенне ўзгодненай эканамічнай палітыкі, паводле яго перакanання, будзе ў значнай ступені стымуляваць такую вытворчасць, спрыяць павышэнню яе экспартнага патэнцыялу. Ну а з такім багажом ніякія санкцыі і меры эканамічнага націску не страшныя. Гэтыя словы Прэзідэнта Беларусі ўдзельнікі сустрэлі апладысментамі.

Пасля кароткага пераезду Аляксандр Лукашэнка і Уладзімір Пуцін прадоўжылі работу ў Крамлі. Асаблівасць пасяджэння Вышэйшага Дзяржсавета Саюзнай дзяржавы, якое прайшло тут, у тым, што на яго парадак, акрамя традыцыйных працэдурных пытанняў, былі ўключаны дзве важнейшыя тэмы практычнага і нават прыкладнога характару. Яны датычыліся супрацоўніцтва, накіраванага на захаванне патэнцыялу машынабудаўнічага комплексу і ўзаемадзеяння ў аграпрамысловым сектары. Гаворка ідзе пра стварэнне інструментаў, якія стымулююць развіццё гэтых сфер, забеспячэнне ўзаемнай свабоднай пастаўкі прадукцыі на рынкі адзін аднаго, устараненне залежнасці ад партнёраў з трэціх краін. Усе гэтыя прапановы, унесеныя Саветам міністраў Саюзнай дзяржавы, прыняты. Прагучала і яшчэ адна цікавая ініцыятыва. Спікер Савета Федэрацыі Валянціна Мацвіенка прапанавала падумаць над магчымасцю адмены роўмінгу на тэрыторыі Саюзнай дзяржавы. Гэтае пытанне дэлегавана для прапрацоўкі адпаведнымі спецыялістамі дзвюх краін. Падводзячы вынікі работы ў Крамлі, Прэзідэнт Беларусі, Старшыня Вышэйшага дзяржаўнага Савета, сказаў:

— Мы зацвердзілі важныя для далейшага руху наперад саюзнай інтэграцыі дакументы. Спадзяёмся, што прынятыя рашэнні і дасягнутыя дамоўленасці актывізуюць далейшае развіццё ўсяго спектра двухбаковых адносін. Галоўны вынік работы ў тым, што мы пацвердзілі гатоўнасць працягваць канструктыўны дыялог, вырашаць самыя вострыя пытанні па ўсіх напрамках супрацоўніцтва. Нашы дзяржавы маюць намер цалкам задзейнічаць саюзны патэнцыял для ўстойлівага развіцця і павышэння ўзроўню дабрабыту нашых народаў.

Уладзімір Пуцін згодны. Вось што ён сказаў:

— Для Расіі ўзаемавыгадная, раўнапраўная інтэграцыя з Беларуссю ў рамках агульнай Саюзнай дзяржавы — гэта адзін са стратэгічных прыярытэтаў. Гэта замацавана і ў канцэпцыі знешняй палітыкі Расіі.

Аляксей **Фядосаў**

# Акцэнт робіцца на інавацыі

## Чацвёрты форум рэгіёнаў Беларусі і Расіі стаў запатрабаванай пляцоўкай для ўзгаднення новых планаў


БЕЛТА

Напярэдадні ВышэйшагаДзяржсавета і форуму, сустракаючыся з дзяржсакратаром Саюзнай дзяржавы Рыгорам Рапотам, Аляксандр Лукашэнка гаварыў пра важнасць злучэння палітычнага дыялогу з практычным увасабленнем волі дзвюх краін да аб'яднання патэнцыялаў у самых розных сферах. Гэты тэзіс знайшоў рэальнае адлюстраванне ў маскоўскіх падзеях, якія дапаўняюць адна адну.

Форум рэгіёнаў пачаўся з адкрыцця выставы ў ЦВК "Экспацэнтр". Экспазіцыя наглядна ілюстравала тэматыку мерапрыемства — "Вектары інтэграцыйнага развіцця рэгіёнаў Расіі і Беларусі ў сферы высокіх тэхналогій, інавацый ды інфармацыйнага грамадства". Выставу адкрывалі спікеры Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч і Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі Валянціна Мацвіенка. Змест іх прывітальных слоў гучаў ва ўнісон.

**Валянціна Мацвіенка:**

— На выставе прадстаўлены дасягненні дзвюх краін у сферы інавацый. Менавіта яны ствараюць аснову для развіцця новай, сучаснай разумнай эканомікі Беларусі і Расіі. Марудзіць з гэтым нельга. Канкурэнцыя на глабальным рынку расце. Мы павінны пераходзіць ад дэкларацый да актыўных дзеянняў, да рэальных дасягненняў, каб захоўваць агульную канкурэнтаздольнасць нашых эканомік.

**А вось што сказаў Міхаіл Мясніковіч:**

— І выстава, і работа ў секцыях, і пленарнае пасяджэнне пацвярджаюць, што ў нашых эканомік вельмі добрая перспектыва. Усе ўзоры і тэхналогіі, якія дэманструюцца, маюць найвышэйшы сусветны ўзровень. Мы заяўляем не толькі пра імпартазамяшчэнне, але і пра тое, што разам можам даволі ўпэўнена адчуваць сябе на сусветных рынках. Кампаніі нашых краін усё больш інвестуюць у сумесныя вытворчасці. Аб'ёмы інвестыцый ужо вылічаюцца мільярдамі долараў. Гэта інавацыйныя праекты, якія запатрабаваны на нашых і знешніх рынках.

Форум рэгіёнаў — гэта яшчэ і маштабная дыскусійная пляцоўка. Тут спецыялісты дзвюх краін у прафесійным дыялогу прыходзяць да вырашэння самых розных працоўных задач. Міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід Заяц абмяркоўваў з калегамі тэму свабодных узаемных паставак харчавання. Тут важная ідэнтычнасць падыходаў да ацэнкі якасці прадукцыі.

**Інфармацыйнае ўзаемадзеянне — таксама актуальная тэма. Міністр інфармацыі Лілія Ананіч лічыць, што тут трэба каардынаваць работу не толькі па вектары традыцыйных СМІ:**

— Трэба ўзаемадзейнічаць у сферы сучасных інфармацыйных тэхналогій. Уся моладзь сёння ў інтэрнэце, і інфармацыю яна чэрпае ў асноўным з сеткі. Калі мы гаворым пра беларуска-расійскі вектар, важна данесці інфармацыю аб тым, што Беларусь і Расія ментальна, гістарычна блізкія і родныя.

**Сумесныя касмічныя праекты ўжо сталі своеасаблівай візітнай карткай беларуска-расійскага супрацоўніцтва. Вось як разважае пра перспектывы гэтай галіны адзін з кіраўнікоў беларускага праекта дыстанцыйнага зандавання Зямлі Сяргей Залатой:**









***На выставе прадстаўлены дасягненні дзвюх краін у сферы інавацый. Менавіта яны ствараюць аснову для развіцця новай, сучаснай разумнай эканомікі Беларусі і Расіі. Марудзіць з гэтым нельга. Канкурэнцыя на глабальным рынку расце. Мы павінны пераходзіць ад дэкларацый да актыўных дзеянняў, да рэальных дасягненняў, каб захоўваць агульную канкурэнтаздольнасць нашых эканомік***

— Мемарандум паміж Нацыянальнай акадэміяй навук і Раскосмасам фарміруе арганізацыю работ па новым касмічным апараце. Апаратуру спадарожніка вырабляе беларускае прадпрыемства, платформу — расійскія партнёры. Ідуць работы па інтэграцыі беларускай наземнай інфраструктуры ў расійскую. Пратакол аб гэтым падпісаны.

**Вялікую цікавасць у наведвальнікаў выставы ў Маскве выклікаў стэнд беларускага Міністэрства аховы здароўя. Руслан Саковіч, кіраўнік цэнтра пазітронна-эмісійнай тамаграфіі РНПЦ анкалогіі, расказаў пра ўнікальныя магчымасці беларускіх медыкаў:**

— Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр прадстаўляе самыя сучасныя на сёння магчымасці дыягностыкі і лячэння анкалагічных захворванняў. Гэта пазітронна-эмісійная тамаграфія, цэлы комплекс даследаванняў у генетыцы, малекулярных тэхналогіях. У нас адзін з наймагутнейшых цэнтраў Еўропы.

Ужо сёння мы прымаем шмат пацыентаў з Расіі. Працуем не толькі па анкалагічным профілі, але і з кардыялагічнымі пацыентамі, якія маюць неўралагічныя, псіхіятрычныя расстройствы.

**Калегу дапаўняе загадчыца аддзялення імуналогіі РНПЦ анкалогіі Юлія Гуляева:**

— Наша лабараторыя ўнікальная. Тут сабраны ўсе дасягненні малекулярнай генетыкі, якія дазваляюць індывідуальна падыходзіць да лячэння кожнага пацыента. На сёння ўжо дакладна вядома: рак — генетычнае захворванне. Кожная пухлінная тканка своеасаблівая. Мы праводзім даследаванні, каб падабраць максімальна эфектыўную тэрапію для кожнага пацыента.

Аповед аб экспазіцыі ў выніку можа атрымацца бясконцым. Але галоўнае тут у канцэнтраваным выглядзе па максімуме сабраны апошнія дасягненні беларускіх і расійскіх спецыялістаў у самых розных сферах. Злучаючыся, іх патэнцыял памнажаецца ў шмат разоў.

Аляксандр **Піменаў**

# Геаграфічная аддаленасць не можа быць перашкодай для дружбы і супрацоўніцтва

## У Беларусі з афіцыйным візітам знаходзіўся Прэзідэнт В'етнама Чан Дай Куанг

Асноўныя палітычныя мерапрыемствы дзяржаўнага візіту Прэзідэнта В'етнама Чан Дай Куанга ў Беларусь прайшлі ў Палацы Незалежнасці: цырымонія ўрачыстай сустрэчы, перагаворы на вышэйшым узроўні ў вузкім і пашыраным фарматах, падпісанне выніковых дакументаў. Аляксандр Лукашэнка з высокім госцем прынялі таксама ўдзел у адкрыцці беларуска-в'етнамскага бізнес-форуму.

— Вялікая адлегласць, але блізкія нашы сэрцы, — так, крыху нават паэтычна, ахарактарызаваў сутнасць узаемаадносін дзвюх краін Прэзідэнт Беларусі. У гэтай дружбы даўняя гісторыя. Партнёрства з В'етнамам злучала яшчэ СССР. І беларускія ВНУ, як ваенныя, так і грамадзянскія, падрыхтавалі шмат кваліфікаваных спецыялістаў для В'етнама. Многія з іх дабіліся немалых кар'ерных вышынь. Так што рускай гаворкай у калідорах ханойскай улады нікога не здзівіш. І памяць пра добрыя адносіны там захоўваюць беражліва.

Чан Дай Куанг наведваў нашу краіну ў другі раз. Упершыню ў Мінску ён пабываў два гады назад, працуючы на пасадзе міністра грамадскай бяспекі. Яшчэ тады ён гаварыў пра цёплыя пачуцці да Беларусі і пра неабходнасць актыўна развіваць узаемадзеянне ва ўсіх сферах. Гэтай жа лініі ён паслядоўна прытрымліваецца на пасадзе Прэзідэнта краіны.

Аляксандр Лукашэнка лічыць В'етнам адным з ключавых партнёраў у Паўднёва-Усходняй Азіі. У кожным рэгіёне свету, дзе прысутнічае беларускі бізнес, безадносна да формы ўласнасці, ёсць дзяржавы, якія адыгрываюць ролю своеасаблівых апор для прасоўвання нашых эканамічных інтарэсаў на больш шырокія тэрыторыі. Мы разам рэалізуем ўзаемавыгадныя праекты і выходзім з вынікам у трэція краіны. Аснова супрацоўніцтва з В'етнамам — прамысловая кааперацыя, інфраструктурныя і аграрныя праекты, здабыча карысных выкапняў. На перагаворах у Палацы Незалежнасці асаблівая ўвага была нададзена тэме

Аляксандр Лукашэнка:

***Дружалюбныя адносіны беларускага і в'етнамскага народаў, якія зарадзіліся яшчэ ў часы Савецкага Саюза, ніколі не перарываліся і ў выніку ўсебаковага і паступальнага развіцця выходзяць на якасна новы ўзровень. Мы не забылі крылаты выраз той эпохі пра адносіны з В'етнамам: "Вялікая адлегласць, але блізкія нашы сэрцы". Ён і сёння як мага лепш характарызуе беларуска-в'етнамскае ўзаемадзеянне***




Чан Дай Куанг:

***Мы высока ацэньваем добрыя палітычныя адносіны і ўзровень даверу паміж дзвюма краінамі, які ўмацоўваецца на працягу 25 гадоў — з моманту ўсталявання дыпламатычных адносін у 1992 годзе... У В'етнама і Беларусі традыцыйна дружалюбныя адносіны, ёсць вялікі патэнцыял для развіцця супрацоўніцтва ў многіх сферах. Я хачу заявіць аб жаданні і рашучасці кіраўніцтва і народа В'етнама ўмацоўваць эфектыўнае ўзаемадзеянне з Беларуссю ў інтарэсах абодвух бакоў***

стварэння да канца года зборачнай вытворчасці МАЗ у В'етнаме, пастаўкам у краіну беларускіх самазвалаў і трактароў. У якасці перспектыўных напрамкаў разглядаецца праект зборачнай вытворчасці гарадскіх пасажырскіх аўтобусаў, удзел беларускіх спецыялістаў у будаўніцтве метро, тунэляў, распрацоўцы нафтавых і горных нетраў. Дарэчы, прадстаўніцтва "Мінскметрапраекта" ўжо працуе ў В'етнаме. І прапанова спраектаваць у Ханоі станцыю "Мінская", а ў Хашыміне "Беларуская" ўспрынята гасцямі з цікавасцю.

Добрыя перспектывы для нарошчвання гандлёва-эканамічнага ўзаемадзеяння адкрывае зона свабоднага гандлю паміж В'етнамам і Беларуссю. У ёй дадатковыя магчымасці для рэалізацыі сумеснай прадукцыі ў краіны — удзельніцы Асацыяцыі дзяржаў Паўднёва-Усходняй Азіі і Еўразійскага эканамічнага саюза. Такім чынам, лічыць Прэзідэнт Беларусі, мы атрымліваем дадатковыя стымулы для выхаду за год-два на тавараабарот у паўмільярда долараў. Партнёры з такімі ацэнкамі згаджаюцца. Пра рэальнасць планаў сведчыць і статыстыка. Калі летась узаемны гандаль у выніку няпростай сусветнай кан'юнктуры крыху прасеў, то ў першыя 4 месяцы гэтага года ён зноў пайшоў у рост. Амаль на 36 працэнтаў, у параўнанні з такім жа перыядам годам раней.

На далейшы прагрэс у дзелавым узаемадзеянні нацэлены і дакументы, падпісаныя па выніках перагавораў. Яны фіксуюць узаемны намер развіваць супрацоўніцтва ў вытворчасці маторнага транспарту, геалогіі, навукова-тэхнічнай сферы, адукацыі, спорце, турызме і культуры, міжрэгіянальныя сувязі. Прэзідэнты дзвюх краін пакінулі свае подпісы пад сумеснай заявай. Яна адлюстроўвае падобныя пазіцыі Мінска і Ханоя па пытаннях міжнародных і двухбаковых адносін. Пацвярджае курс на паслядоўнае развіццё і ўмацаванне традыцыйна дружалюбных сувязяў паміж нашымі дзяржавамі і народамі.

Чан Дай Куанг запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць В'етнам у зручны для яго час. Запрашэнне прынята. Тэрміны візіту будуць узгодненыя па дыпламатычных каналах.

Яўген **Панамароў**

З сумеснай заявы прэзідэнтаў Беларусі і В'етнама:

***Бакі пагадзіліся, што дзяржаўны візіт у Рэспубліку Беларусь Прэзідэнта Сацыялістычнай Рэспублікі В'етнам Чан Дай Куанга ўнёс важны ўклад ва ўмацаванне атмасферы традыцыйнй дружбы, усебаковага супрацоўніцтва і з'яўляецца важным крокам на шляху да ўсталявання стратэгічнага партнёрства паміж Рэспублікай Беларусь і Сацыялістычнай Рэспублікай В'етнам***

# Місія бізнесу выкапальная

## У дні візіту Прэзідэнта В'етнама ў Мінск адбыўся Беларуска-В'етнамскі бізнес-форум

Беларуска-В'етнамскі бізнес-форум прайшоў у Палацы Рэспублікі. Прэзідэнты дзвюх краін прыбылі сюды да адкрыцця мерапрыемства. Прэзентацыя экспартнага патэнцыялу нашай краіны заняла цэлы паверх вялікага будынка. Чаго тут толькі не было: ад макетаў прадукцыі машынабудавання да беспілотнікаў і найноўшых распрацовак у медыцыне.

Яшчэ да пачатку форуму бізнесмены абедзвюх краін у размове назвалі гэтае мерапрыемства не інакш як гістарычным у адносінах нашых краін. Па-першае, значнасць яму надавала прысутнасць кіраўнікоў дзяржаў. Па-другое, цікавасць да форуму праявілі больш за 60 в'етнамскіх кампаній і каля ста прадстаўнікоў дзелавых колаў гэтай краіны. А гэта гаворыць пра тое, што геаграфічная аддаленасць не можа быць перашкодай для ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва і шчырай дружбы. Аляксандр Лукашэнка вельмі ёміста выказаў актуальнасць такіх сустрэч:




БЕЛТА




— Бізнес павінен мець зносіны, а палітыкі ствараць для гэтага спрыяльныя ўмовы.

Сумнявацца ва ўзаемнай карысці такіх кантактаў не даводзіцца. Эксперты нездарма называюць В'етнам "тыграм Азіі, які крадзецца". Паводле прагнозаў, у бліжэйшыя 15-20 гадоў эканоміка гэтай краіны будзе прырастаць на 6-7 працэнтаў у год. Уражлівы дынамізм. Але і наша краіна па многіх паказчыках лідзіруе ў СНД. Узаемадапаўняльнасць нашых эканомік і далучэнне Ханоя да зоны свабоднага гандлю з Еўразійскім эканамічным саюзам і ёсць той падмурак, на якім павінна выбудоўвацца будучыня нашых адносін. Задзел ужо створаны прыстойны. Ад хуткага адкрыцця зборачных вытворчасцяў грузавікоў і аўтобусаў да запуску пілотнага праекта па выпуску ў В'етнаме прадукцыі з сухога малака.

Нашы тэхналогіі запатрабаваныя ў будаўнічай індустрыі В'етнама. Набірае абароты супрацоўніцтва ў галіне інфармацыйна-камунікацыйных і высокіх тэхналогій.

У цэлым Прэзідэнт Беларусі сфармуляваў шэсць канкрэтных перспектыўных напрамкаў двухбаковага супрацоўніцтва і запрасіў в'етнамскіх бізнесменаў выкарыстоўваць Беларусь у якасці пляцоўкі для асваення рынкаў краін Еўропы:

— Будзьце ўпэўненыя, у нашай краіне вы атрымаеце самыя камфортныя ўмовы для работы. Прыязджайце, вырабляйце і прадавайце прадукцыю не толькі ў Беларусі, але і на агульнай эканамічнай прасторы Еўразійскага эканамічнага саюза. Гэты маштабны рынак і лагістыка з улікам блізкасці Беларусі да Балтыйскага мора робяць праекты ў нас вельмі выгаднымі.

Са свайго боку Прэзідэнт В'етнама Чан Дай Куанг таксама паабяцаў падтрымку кампаніям, якія шукаюць магчымасці для супрацоўніцтва з Беларуссю:

— Беларусь — наш стратэгічны партнёр у еўразійскім рэгіёне. В'етнам будзе вітаць беларускія інвестыцыі, асабліва ў машынабудаванні, вытворчасці прамысловага абсталявання. З улікам узаемадапаўняльнасці нашых эканомік мы можам злучаць нашы вытворчасці, ствараць новыя і займацца сумесным экспартам на глабальны рынак.

Па выніках форуму падпісана нямала дагавораў і кантрактаў. Іх дакладная сума яшчэ падлічваецца. Але справа нават не ў лічбах, а ў тым, што мы знаходзім новых партнёраў і выходзім на новыя рынкі. А гэта важнейшы залог эканамічнай бяспекі.

Уладзімір **Хромаў**

## Гавораць удзельнікі форуму

**Лі Куанг Хуан, кіраўнік карпарацыі Ba La Xanh:**

*— Наша кампанія ўжо дваццаць гадоў працуе на в'етнамскім рынку, займаецца продажам угнаенняў, энергазберагальнымі тэхналогіямі. Нас вельмі зацікавіў беларускі досвед у вядзенні сельскай гаспадаркі. Ваша прадукцыя прыцягвае сваёй якасцю і канкурэнтаздольная па цане. Цяпер вывучаем магчымасць дастаўкі калійных угнаенняў у нашу краіну.*

**Сяргей Маргуноў, намеснік гендырэктара ААТ "Белшына":**

*— Мы ўжо абмеркавалі пытанне пастаўкі натуральнага каўчуку з В'етнама. Цяпер на чарзе пагадненне на экспарт шын для буйнагабарытнай тэхнікі, якая працуе на вугальных разрэзах В'етнама. Думаю, да канца года зможам ажыццявіць першыя пастаўкі.*

**Вадзім Савіч, першы намеснік дырэктара Інстытута парашковай металургіі НАН Беларусі:**

*— З В'етнамам мы працуем ужо восем гадоў. Выканалі кантракт у сферы машынабудавання, арганізавалі сумесную вытворчасць фрыкцыйных дыскаў для буйнагабарытнай тэхнікі. Сёння разглядаем новыя праекты, частка з іх носіць закрыты характар. Але магу сказаць, што мы гатовыя прадаставіць тэхналогіі па ўтылізацыі боепрыпасаў.*

**Уладзімір Улаховіч, старшыня Беларускай гандлёва-прамысловай палаты:**

*— Наша партнёрства сёння на парозе новай сітуацыі, якая звязана з далучэннем В'етнама да зоны свабоднага гандлю з ЕАЭС. Прыкладна 60 працэнтаў мытных пошлін ва ўзаемным гандлі ў бліжэйшы час будзе фактычна адменена. Да 2025 года іх практычна не застанецца. Для нас гэта адкрывае выхад на рынак краін АСЕАН — а гэта дзесяць дзяржаў і 600 мільёнаў спажыўцоў.*

# Як вырошчваюць клеткі. Ствалавыя

**Лячэнне апёкаў, трафічных язваў, парадантыту, пашкоджанняў рагавіцы — здаецца, ствалавым клеткам усё пад сілу. Сёння ў Рэспубліканскім навукова-медыцынскім цэнтры “Клетачныя тэхналогіі” пры Інстытуце біяфізікі і клетачнай інжынерыі Нацыянальнай акадэміі навук гатовыя вырасціць унікальныя клеткі для адной тысячы пацыентаў у год. Тут жа створаны банк для іх захоўвання. Наш карэспандэнт ад пачатку да канца паглядзела, як навукоўцы вырошчваюць каштоўны біяматэрыял.**



## У стэрыльных умовах

— Цалкам здымайце з сябе вопратку, надзявайце медыцынскі касцюм, бахілы, — малодшы навуковы супрацоўнік цэнтра Ірына Васілевіч працягвае мне ўніформу. — І гэта толькі першы этап. Усяго вы пройдзеце некалькі зон чысціні.

Да чаго мяне рыхтуюць? Усё проста. Праз пару хвілін я траплю ў вытворчы аддзел — гэта святая святых для тутэйшых спецыялістаў. Тут выдзяляюць і вырошчваюць мезенхімальныя ствалавыя клеткі. Іх потым выкарыстоўваюць для лячэння або замарожваюць. Напрыклад, сёння медыкі з дапамогай уласных ствалавых клетак пацыента паспяхова лечаць трафічныя язвы. Прычым такія язвы, якія не загойваліся ў хворых гадамі. Натуральна, такія “парасткі” вырасціць няпроста. Толькі правілы па абслугоўванні аддзела, нарматывы па яго прыбіранні і дэзынфекцыі займаюць некалькі важкіх папак. Клеткі прызначаны для трансплантацыі, таму павінны вырошчвацца ва ўмовах асаблівай стэрыльнасці. Таму перад уваходам у вытворчы аддзел і дыктафон, і фотаапарат Ірына Васілевіч старанна апрацоўвае антысептыкам. Нарэшце дзверы адчыняюцца. Я заходжу ў першую зону чысціні. Ад другой яна аддзелена невысокім услончыкам. Ірына Барысаўна інструктуе: трэба надзець яшчэ адну пару бахіл. Надзяваеш на адну нагу — пераносіш ступню цераз услон. Так і з другой — перамяшчаеш, толькі надзеўшы новы слой абароны. Затым на чарзе — маска і шапачка. Рукі неабходна старанна апрацаваць антысептыкам. Наступная зона чысціні — за дзвярамі.

Аказваецца, на гэтым мае пераапрананні не заканчваюцца. Ірына Васілевіч працягвае ахоўны камбінезон з капюшонам, пальчаткі ды анучныя боты. З непрывычкі хутка адзецца ў такую ўніформу не атрымліваецца. Падыходжу да люстэрка і лаўлю сябе на думцы, што падобная да персанажа з футурыстычнага фільма. Дарэчы, люстэрка тут для таго, каб прасачыць, ці няма ў чалавека незакрытых участкаў — ці не аголена шыя, ці не выбіліся з-пад шапачкі валасы.

Вытворчы аддзел вельмі падобны да касмічнага карабля, які складаецца з некалькіх блокаў. Кожны з іх знаходзіцца за сваімі дзвярамі. Трапіць у іх можна толькі прыклаўшы картку. І менавіта тады дзверы бясшумна адчыняюцца. Ушчыпніце мяне, падаецца, што я сапраўды ў кіно!

Словы старшага навуковага супрацоўніка Сяргея Пінчука выводзяць мяне са здранцвення:

— Мезенхімальныя ствалавыя клеткі выдзяляюць з тлушчавай тканкі пацыента. Вось глядзіце, яе нам перадаюць у спецыяльным кантэйнеры праз перадатачнае акно. У вытворчым блоку выдзяляецца першасная культура клетак. Усе маніпуляцыі робім у ламінарнай шафе. Яе вентыляцыйная сістэма зроблена так, што нават калі ёсць якія-небудзь бактэрыі, яны не трапляюць на біялагічныя матэрыялы. Потым клеткі пачынаюць культывавацца — размнажвацца. Наступны крок — мікрабіялагічны кантроль. Калі матэрыял чысты, яго нарошчванне адбываецца ў іншым боксе.

Заглядаем у гэты бокс. У ім — 4 інкубатары. Тут могуць вырошчваць вялікую колькасць біяматэрыялу. Для гэтага ствалавыя клеткі змяшчаюцца ў спецыяльныя флаконы, напоўненыя ружовай вадкасцю. У інкубатарах — ідэальныя ўмовы для размнажэння клетак. Можна сказаць, што тут для іх створаны курортныя ўмовы. Нездарма з 2-3 грамаў тлушчавай тканкі за месяц вырастае каля 4 мільёнаў ствалавых клетак. Ёсць клеткі, якія дзеляцца хутчэй. Як правіла, ад маладых пацыентаў. У пажылых людзей ствалавых клетак прыкладна ў дзясяткі разоў менш, чым у юных. Таму клеткі, донарамі якіх сталі людзі ва ўзросце або з захворваннямі, растуць менш ахвотна.

## Сіла вyратавання

Скрозь шкло флакона гляджу на ружовую вадкасць. Складана паверыць, што ў ёй — выратаванне для многіх людзей. Бо лячэнне трафічных язваў — гэта толькі адна з унікальных здольнасцяў ствалавых клетак. А колькі адкрыццяў яшчэ наперадзе? Сяргей Пінчук гаворыць пра планы:

— Літаральна з гэтага года запусцілі адразу некалькі праектаў. Плануем распрацаваць методыкі, якія з дапамогай ствалавых клетак дазволяць пацыентам пазбавіцца ад мацнейшых апёкаў, пролежняў, хвароб парадантыту, пашкоджанняў рагавіцы і нават вылечыць стрэсавае нетрыманне мачы ў жанчын.

Пасля лячэння заўсёды можна замарозіць свае ствалавыя клеткі — яны яшчэ могуць спатрэбіцца.

Зрэшты, любы з нас можа звярнуцца ў цэнтр, каб пакінуць свой біяматэрыял. На ўсякі пажарны. Выдзяленне біяматэрыялу і крыязамарожванне каштуе ад 150 рублёў, крыязахоўванне — 70 рублёў у год. Захоўваць іх можна ў спецыяльным крыясховішчы або банку.

Сяргей Пінчук прыкладвае картку: сістэма допуску да памяшкання спрацоўвае, і дзверы расчыняюцца:

— Тут ствалавыя клеткі захоўваюцца. Іх можна замарозіць у двух рэжымах. Пры тэмпературы мінус 85 клеткі будуць захоўвацца паўгода, пры мінус 150 градусаў — гадамі.

Сяргей Пінчук адзявае шчыльныя прагумаваныя пальчаткі — без іх немагчыма апусціць руку ў крыясховішча. Потым прыадкрывае вечка. Усё гэта нагадвае вялікі халадзільнік. Усе ствалавыя клеткі захоўваюцца ў кантэйнерах. Кожны з іх пранумараваны і зашыфраваны. Але проста так ствалавыя клеткі сюды не змесціш. Таму ў іх дабаўляюць крыяпратэктары — рэчывы, якія абараняюць ад пашкоджвальнага дзеяння замарожвання. Цяпер у банку захоўваецца паўтара мільярда мезенхімальных ствалавых клетак.

Сёння медыцынская грамадскасць прадастаўляе дадзеныя аб тым, што на аснове ствалавых клетак магчыма стварэнне лекавых формаў для прымянення ў кардыялогіі, эндакрыналогіі, гепаталогіі, траўматалогіі і хірургіі. Нават цяпер выкарыстанне ствалавых клетак, напрыклад, у траўматалогіі, уражвае: загойваецца тое, што ў прынцыпе не павінна гаіцца. Беларускія навукоўцы таксама не стаяць убаку, а працягваюць вывучаць магчымасці ўнікальнага біяматэрыялу і рабіць адкрыцці.

Таісія **Азановіч**

***У ЗША кошт выдзялення і крыякансервацыі клетак даходзіць да $2.000, а іх захоўванне — $100-150 у год. У Расіі адпаведна 1.000 і 100 долараў, у Беларусі — $75 і $40 адпаведна***




У флаконах, напоўненых ружовай вадкасцю, вырошчваюць ствалавыя клеткі

# Калі падысці да справы беражліва і па-наватарску



## “Зялёныя праекты” з поспехам рэалізуюцца ў Барысаўскім і Крупскім раёнах Мінскай вобласці

Унесці ўклад у гэты “зялёны” праект змогуць як прадпрыемствы раёнаў, так і мясцовыя жыхары. Справа ў тым, што наладзіць збор адпрацаваных маслаў для іх далейшай перапрацоўкі дазволяць пяцьдзясят новых спецыялізаваных пунктаў. Дарэчы, у шасці з іх можна здаць адпрацаваныя маслы і атрымаць грошы.

Паспяховая рэалізацыя ініцыятывы дасць магчымасць забяспечыць другасную перапрацоўку адпрацаваных машынных маслаў, пазбегнуць іх зліву ў глебу і спальвання ў печах. Тым самым знізіць забруджванне навакольнага асяроддзя. Адпрацаваныя маслы — небяспечныя адходы. Усяго адзін літр такога маторнага масла, вылітага ў глебу, робіць непрыдатным да 1000 тон грунтавых вод. Акрамя таго, прадукты спальвання маслаў утрымліваюць цяжкія металы і канцэрагены. Такім чынам, стварэнне сістэмы збору і перапрацоўкі адпрацаваных маслаў дасць магчымасць знізіць негатыўнае ўздзеянне як на прыроду, так і на здароўе чалавека.

Варта сказаць, што гэтая пілотная сістэма створана НДА “Экалагічная ініцыятыва” ў межах праекта “Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да “зялёнай” эканомікі”, фінансуемага Еўрапейскім саюзам і рэалізуемага Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.



Перапрацоўка сабраных маслаў наладжана на адкрытым у 2015 годзе комплексе “ДВЧ-менеджмент” у гарадскім пасёлку Крупкі Мінскай вобласці



Для стварэння сістэмы за сродкі ЕС былі закупленыя і ўсталяваныя пяцьдзясят кантэйнераў, што не дапускаюць праліваў, а таксама пяцісекцыйная цыстэрна для іх бяспечнай перавозкі, якая дазваляе сартаваць маслы ўжо на стадыі збору. У бліжэйшы час колькасць усталяваных кантэйнераў вырасце да сямідзесяці.

*У хуткім часе досвед рэалізацыі пілотнай ініцыятывы ў Барысаўскім і Крупскім раёнах стане асновай для стварэння сістэмы збору і перапрацоўкі адпрацаваных маслаў у маштабе краіны*

Так, “зялёныя” кантэйнеры для збору адпрацаваных маслаў ужо з’явіліся на 50 прадпрыемствах Барысаўскага і Крупскага раёнаў, якія сталі партнёрамі ініцыятывы. У іх ліку такія буйныя арганізацыі, як “Барысаўдрэў”, папяровая фабрыка, Крупскае ўпраўленне магістральных газаправодаў ААТ “Газпрам трансгаз Беларусь” ды іншыя. А шэсць пунктаў прыёму адпрацаваных маслаў ад насельніцтва былі адкрытыя на базе ўжо існуючых пунктаў прыёму другсыравіны.

Транспарціроўку адпрацаваных маслаў з пунктаў збору да месца перапрацоўкі забяспечвае спецыяльна распрацаваная лагістычная схема. Перапрацоўка сабраных маслаў наладжана на адкрытым у 2015 годзе комплексе “ДВЧ-менеджмент” у гарадскім пасёлку Крупкі ў Мінскай вобласці.

Пры распрацоўцы новай сістэмы збору і перапрацоўкі адпрацаваных маслаў улічваўся досвед еўрапейскіх краін. Інавацыйная для Беларусі сістэма дасць магчымасць збіраць і перапрацоўваць на прадпрыемстве 10 тон адпрацаваных маслаў у квартал. Ужо сёння прадукты перапрацоўкі маслаў, сабраныя ў рамках новай сістэмы, выкарыстоўваюцца пры вытворчасці сценавых панэляў дамоў, антызлежвальных рэагентаў для транспарціроўкі калію, а таксама веласіпедных змазак.




У хуткім часе досвед рэалізацыі пілотнай ініцыятывы ў Барысаўскім і Крупскім раёнах стане асновай для стварэння сістэмы збору і перапрацоўкі адпрацаваных маслаў у маштабе краіны. Паводле папярэдніх разлікаў, калі ў Беларусі будзе збірацца 50 працэнтаў адпрацаваных маслаў, якія сёння знаходзяцца па-за афіцыйным абаротам (прыблізна 40 000 тон), то эканамічны эфект дзяржаве ад падатковых паступленняў ды імпартазамяшчэння складзе каля 18 мільёнаў долараў у год. Далейшае развіццё комплекснай сістэмы збору і перапрацоўкі адпрацаваных маслаў акрамя ўсяго дазволіць стварыць новыя рабочыя месцы.

Уладзімір **Веліхаў**






# Экалагічныя сцежкі ў загадкавым краі

## Унікальны Цэнтр міфалагічнага турызму адкрыўся ў Бярэзінскім запаведніку

Цэнтр створаны Беларускім грамадскім аб'яднаннем "Адпачынак у вёсцы" і Бярэзінскім запаведнікам у рамках маштабнага праекта "Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да "зялёнай" эканомікі", фінансуемага Еўрапейскім саюзам і рэалізуемага Праграмай развіцця ААН у партнёрстве з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Беларусі.

У аснове Цэнтра міфалагічнага турызму ляжыць унікальны і багаты свет беларускай міфалогіі, якая пакуль яшчэ не так часта выкарыстоўваецца ў турыстычных праграмах і мае вялікі патэнцыял у развіцці этнаграфічнага турызму. Створаны цэнтр уключае ў сябе Музей міфалагічных істот, экспазіцыю пад адкрытым небам "Міфалагічны хутарок" і экалагічную сцежку "У краі міфаў".

Як мяркуюць эксперты, адкрыццё першага ў Беларусі Цэнтра міфалагічнага турызму створыць умовы для развіцця экатурызму ў Лепельскім раёне і прыцягне ў адзіны ў краіне біясферны запаведнік новых наведвальнікаў.

Ідэя ж унікальнай ініцыятывы заключаецца ў тым, каб расказаць пра беларускую прыроду, выкарыстоўваючы вобразы з нацыянальнай міфалогіі. Продкі сучасных беларусаў лічылі, што кожны біятоп — лес, балоты, вадаём, поле — мае свайго











“апекуна”: лесуна, балотніка, палевіка… І адносіны чалавека з прыродай рэгуляваліся гэтымі істотамі. Такую ж канцэпцыю адлюстроўваюць усе аб’екты створанага цэнтра.

Варта адзначыць, што музей міфалагічных істот у Бярэзінскім запаведніку створаны з дапамогай інавацыйных падыходаў да інтэрпрэтацыі беларускай міфалагічнай спадчыны. Пры яго распрацоўцы стваральнікамі быў вывучаны шырокі пласт даследаванняў у галіне нацыянальнай міфалогіі. У аснове канцэпцыі музея ляжыць мадэль “Сусветнага дрэва”. Тут турыстаў чакае загадкавы і незвычайны свет міфалагічных істот і духаў, якія ўзноўлены з дапамогай тэатралізаваных гукавых і светлавых установак дзякуючы прымяненню сучасных аўдыявізуальных прыёмаў. Акрамя таго, музей аснашчаны малой сонечнай электрастанцыяй, якая расказвае пра таямніцы энергіі сонца сучаснай мовай.

*Продкі сучасных беларусаў лічылі, што кожны біятоп — лес, балоты, вадаём, поле — мае свайго “апекуна”: лесуна, балотніка, палевіка… І адносіны чалавека з прыродай рэгуляваліся гэтымі істотамі. Такую ж канцэпцыю адлюстроўваюць усе аб’екты створанага цэнтра*

Адметнасць экалагічнай сцежкі — 17 незвычайных установак, створаных пры ўдзеле вядомых беларускіх дызайнераў і скульптараў. Сярод вобразаў установак — Русалка, Аржавейнік, Палявік, Пушчавік ды многія іншыя міфалагічныя персанажы.

Каб зрабіць візіт у цэнтр для наведвальнікаў яшчэ больш эмацыйным і запамінальным, спецыяльна для экасцежкі была распрацавана ўнікальная начная экскурсія. З надыходам цемры госці адпраўляюцца ў начное падарожжа, трапіць у якое можна толькі прайшоўшы праз асаблівы “партал” і вымавіўшы традыцыйную беларускую замову, каб засцерагчы сябе ад цёмных сіл.

Праект “Садзейнічанне пераходу Рэспублікі Беларусь да “зялёнай” эканомікі”, у рамках якога створаны Цэнтр міфалагічнага турызму, аказвае садзейнічанне ў фарміраванні эканамічнага росту краіны, заснаванага на “зялёных” прынцыпах, уключаючы эканамічна мэтазгоднае выкарыстанне прыродных рэсурсаў, папулярызацыю экалагічнай вытворчасці і спажывання, стварэнне “зялёных” працоўных месцаў, змену мадэляў паводзінаў прадстаўнікоў мэтавых груп у бок большай экалагічнай устойлівасці.

Уладзімір **Міхайлаў**

# Гасцінна запрашаем, турыст!

**Колькасць замежнікаў, якія скарысталіся з лютага магчымасцю ўехаць у Беларусь без візы на пяцідзённы тэрмін, да лета перасягнула рубеж у 20.000 чалавек**



ВІТАЛІЙ ПІВАВАРЧЫК

Ды вось незадача: многія турфірмы падрыхтавалі для гасцей цікавыя праграмы знаходжання ў краіне, аднак ажыятажнага попыту на іх паслугі з боку замежных візіцёраў пакуль няма. Эксперты сферы гасціннасці адзначаюць: увядзенне пяцідзённага бязвізавага рэжыму для грамадзян 80 краін пакуль не знайшло належнага водгуку шмат у чым таму, што за мяжой пра гэта новаўвядзенне ведаюць слаба. Сітуацыя папраўная.

Начальнік аддзела маркетынгу і якасці турысцкіх паслуг Дэпартамента па турызме Міністэрства спорту і турызму Ганна Муха агучыла такую інфармацыю: бязвізавым уездам у краіну (дзейнічае з 12 лютага 2017 года) скарысталіся турысты з 65 краін. У Нацыянальным агенцтве па турызме ўдакладняюць: часцей за ўсё да нас прыязджаюць прадстаўнікі Германіі, затым ідуць Польшча, Італія, Вялікабрытанія, ЗША, Нідэрланды... Замежныя падарожнікі пакуль не выстройваюцца ў чаргу ў Беларусь, хоць на вуліцах Мінска замежнікаў стала відавочна больш. Справа ў іншым — з якімі мэтамі яны прыязджаюць да нас, што іх можа зацікавіць?

— Прыязджаюць да нас у асноўным бізнес-турысты, — начальнік аддзела маркетынгу Нацыянальнага агенцтва па турызме Ірына Гардзіенка прыводзіць у прыклад суседзяў-літоўцаў, якія гатовыя накіроўвацца па справах у Беларусь па паветры, хоць білеты і нятанныя. — У той жа час мы атрымліваем прэтэнзіі ад турыстычных агенцтваў: "Дзе ж замежнікі — у нас заказаў не дадалося". Сапраўды, тых, хто прыбывае ў Мінск праз Нацыянальны аэрапорт самастойна, хутчэй можна знайсці ў канферэнцзалах ці, наадварот, у нейкіх тусовачных месцах на вуліцы Зыбіцкай, чым у офісах турфірм.

Бязвізавы турыст пакуль слаба даследаваны аб'ект. Гэта не абавязкова чалавек у складзе арганізаванай групы. Што яго прывяло ў Беларусь? Які яго сацыяльны статус, фінансавыя магчымасці? Ці ведае ён пра тое, што яму гатовыя прапанаваць шырокі спектр сэрвісных паслуг? Статыстычных выкладак на гэты конт пакуль няма. Ды і ў цэлым адсачыць дакладную статыстыку адносна турыстаў, якія прыбываюць у Беларусь, даволі складана. Белстат агучвае дадзеныя па арганізаваных групах — звесткі прадастаўляюць турфірмы. У Нацыянальным агенцтве па турызме аддаюць перавагу статыстыцы Дзяржпагранкамітэта — там адлюстроўваецца колькасць замежнікаў, якія перасеклі мяжу Беларусі. Зразумела, што хтосьці прыязджае да сваякоў, па рабочых справах, але гэта таксама турысты, яны таксама пакідаюць свае грошы. Пра тое, што бязвізавы рэжым кароткатэрміновых паездак спарадзіў новы сегмент падарожнікаў, ускосна сведчыць і інфармацыя менеджара па маркетынгу Minsk Marriott Hotel Ягора Дзенісёнка:

**Факт**

■ **Адзін з перспектыўных напрамкаў прыцягнення замежных гасцей у Мінск — медыцынскі турызм. У сталіцы больш за 120 устаноў аховы здароўя прапаноўваюць высокакваліфікаваную дапамогу пацыентам з-за мяжы. Найбольш запатрабаваныя паслугі — стаматалагічныя і касметалагічныя, а таксама аперацыі па перасадцы органаў, пластычная хірургія, спа-працэдуры.**



Верхні горад у Мінску. Від на Траецкае прадмесце

## Даслоўна



**Аляксандр Сурыкаў, Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Расіі ў Беларусі:**

*— Працуем (расійскі і беларускі бакі — Заўв. рэд.) над наступным этапам дакумента аб узаемным прызнанні віз. Выдала Беларусь, умоўна кажучы, візу грамадзяніну Германіі, і яна аўтаматычна прызнаецца ў Расіі. Такім чынам, гэты грамадзянін трэцяй краіны можа без усялякіх пытанняў прыбыць на тэрыторыю Расіі і наадварот. Я так разумею, што да канца года гэта міжурадавае пагадненне будзе гатовае.*

*(З інтэрв'ю праграме "Галоўны эфір" тэлеканала "Беларусь 1")*

— Marriott — гатэль хутчэй не для масавага турыста, а для прадстаўнікоў бізнесу ды арганізаваных груп. У апошнія месяцы істотных змен у патоку кліентаў не назіраецца: 30 працэнтаў — гэта расіяне, беларусы на другім месцы, на трэцім — грамадзяне Турцыі.

На думку эксперта, каб турпаток у нашу краіну павялічваўся, трэба больш актыўна расказваць пра Беларусь за мяжой. Ягор Дзенісёнак успамінае сваю прэзентацыю з нагоды адкрыцця мінскага гатэля. Да замежных партнёраў удалося "дастукацца" толькі дзякуючы аповеду пра тэхнічныя распрацоўкі з Беларусі — дадатак MSQRD для сацсетак, Viber, анлайн-гульню World of Tanks. Рэаліі не даюць сферы гасціннасці спачываць на лаўрах: еўрапейскі турбізнес, які толькі нядаўна адкрыў для сябе краіны Балтыі, пра нас ведае яшчэ мала. Таму для папулярызацыі Беларусі, напэўна, усе сродкі добрыя. Мясцовыя ініцыятывы вітаюцца. Добры прыклад — райцэнтр Глыбокае на Віцебшчыне. Маючы багатыя прыродныя і гістарычна-культурныя рэсурсы, ён у апошнія гады рэгулярна на слыху дзякуючы шматлікім фестывалям ды іншым нестандартным ініцыятывам. Дарэчы, знакаміты мясцовы Вішнёвы фестываль пройдзе там зусім хутка, з 18 па 22 ліпеня.

Выгаду можна атрымаць нават з таго, што пяцідзённы бязвізавы рэжым дзейнічае пры ўмове прыбыцця гасцей толькі праз Нацыянальны аэрапорт "Мінск", перакананы кансультант у сферы авіяцыйнага бізнесу, былы кіраўнік Нацыянальнага агенцтва па турызме Рыгор Памяранцаў:

— Транзіт — добры рэсурс для развіцця ўязнога турызму. На мой погляд, прадстаўніцтвы кампаніі "Белавія" за мяжой маглі б больш актыўна "прадаваць сябе", паслугі пералёту ў пакеце з магчымасцю наведаць краіну на некалькі дзён без візы і з турыстычнай праграмай. Каб замежны госць зрабіў прыпынак у нас, трэба кансалідаваць намаганні ўсіх зацікаўленых бакоў з нашага боку, замежных партнёраў. Варта таксама падумаць над магчымасцю адкрыцця рэгулярных рэйсаў, у тым ліку замежных кампаній, у рэгіянальныя беларускія аэрапорты.

Не выключана, што тэрміны бязвізавага знаходжання замежнікаў у Беларусі ў перспектыве будуць павялічаны. Гэта было б выгадна, да прыкладу, санаторна-аздараўленчым арганізацыям: курс лячэння там доўжыцца не менш за 18 дзён. Але і з пяцідзённага тэрміну яшчэ не ўсё "выціснута". Сапраўды, калі хоць бы 2-3 працэнты транзітных авіяпасажыраў удалося б на пяць дзён "апусціць на зямлю" ў цэнтры Еўропы, арганізаваць начлег у трохзоркавым гатэлі і паказаць Мінск — гэта ўжо вялікі аб'ём работы. І, магчыма, задзел на будучыню: гасціннасці і добразычлівасці беларусам не займаць, і станоўчыя эмоцыі ад экспрэс-наведвання Мінска маглі б падштурхнуць гасцей зазірнуць у нашу краіну як мінімум яшчэ раз.

Аляксандр **Несцераў**

## Планы

■ **Тэрмін бязвізавага знаходжання для замежнікаў можа быць павялічаны ў перыяд правядзення II Еўрапейскіх гульняў. Міжнародны спартыўны форум пройдзе ў Мінску з 21 па 30 чэрвеня 2019 года. Некаторыя спаборніцтвы могуць пачацца за дзень да афіцыйнага старту Гульняў. Чакаецца, што ў Еўрапейскіх гульнях прымуць удзел 4.000 спартсменаў і 2.000 афіцыйных асоб.**




СЯРГЕЙ ЛАЗЮК

# Жыватворная крыніца адметнага натхнення

**У сталіцы атмасфера шумных і яркіх народных гулянняў у гонар Дня Незалежнасці з'явілася загадзя — яшчэ 2 ліпеня. Пляцоўка, якая разгарнулася ля Палаца спорту і з забавамі, і з разнастайнымі пачастункамі, стала своеасаблівай рэпетыцыяй вялікага свята. Але ўвагай гасцей завалодалі не шчыльныя гандлёвыя рады. Маштабнае і маляўнічае свята "Дзень вышыванкі" — таксама.**

Фестываль з акцэнтам на нацыянальны каларыт і гісторыю для Мінска пара лічыць нязменным і добрым спадарожнікам Дня Незалежнасці — у той жа дзень ён праходзіць другі год запар. І высокія госці свята як адзін адзначалі, што пакладзены пачатак добрай традыцыі, якую ні ў якім разе не трэба перарываць.

— Дрэнна, што такое цудоўнае свята мы адзначаем усяго другі раз за нашу гісторыю. Але, упэўнены, што ў кожнага сапраўднага беларуса гэтая вышыванка, арнамент — у сэрцы. Мы па-рознаму называліся, на нашай тэрыторыі мяняліся законы і межы, але ў беларусаў унутры захоўваўся гэты код — стрыжань народа. У гэтым арнаменце праз усе пакаленні захаваліся традыцыі і рысы нашага народа, у ім выяўляліся нашы адносіны да свету, жыцця, продкаў, нашых перамог. І вельмі важна, што сёння гэты арнамент з намі, мы захавалі яго праз культуру і мастацтва. І гэтак жа важна, каб мы гэта памяталі і ведалі, — вітаў гасцей свята Першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта Максім Рыжанкоў.

"Беларусь — краіна натхнення" — гэтыя словы сталі дэвізам і слоганам гэтага свята. Галоўны ж яго сімвал адзін, і ён нязменны — безумоўна, вышыванка ва ўсіх варыяцыях ды іпастасях. Народны арнамент у гэты дзень мільгацеў і на кашулях, і на зграбных сукенках, і на кераміцы, і на тонка вышытых ручніках. Геаметрычныя ўзоры, якія ні з чым не зблытаеш, можна было ўбачыць і на класічных уборах нашых продкаў, якія прадстаўлялі ўдзельнікі гістарычных суполак, і на сучасным адзенні — ва ўборах, натхнёных вышыванкай, дэфілявалі па сцэне мадэлі.

І мяркуючы па ўхваляльных і гучных апладысментах, публіка была гатовая ўбачыць гэтыя ўзоры не толькі на імправізаваным подыуме, але і ў сябе ў гардэробе. Тут на дапамогу і прыходзілі прадбачліва расстаўленыя палаткі, якія прапаноўвалі багаты асартымент тавараў з народнымі матывамі — ад кубкаў і збаноў да маек і абрусаў. І да некаторых выстройваліся сапраўдныя чэргі. Жывы інтарэс наведвальнікаў фестывалю выклікалі палаткі, дзе не столькі гандлявалі, колькі прадстаўлялі традыцыі і промыслы роднага краю з векавой гісторыяй.

У вялікай дэлегацыі з Рагачова было адразу два "філіялы": у "гаспадарчым" паліцы былі запар застаўлены драўляным начыннем, багата ўпрыгожаным тонкай разьбой, а ў "харчовай" палатцы, дзе гасцей шчодра частавалі пірагамі, першым у вочы кідаўся сапраўдны... рог дастатку! Са здобы характэрнай формы быццам на самай справе вылятаці булачкі і калачы — сапраўдны шэдэўр пякарскага мастацтва. Марына Ражкова, якая наразала пірог, на камплімент толькі з усмешкай развяла рукамі — а ці магло быць інакш:

— Рог — сімвал нашага горада, таму мы і прывезлі на свята рог дастатку. Тут у нас прадстаўлена тое, чым ганарацца хлебапекары нашага раёна. А яшчэ зборы карысных траў, якія нашы продкі выкарыстоўвалі замест чаю.

Паставы ж па праву ганарыліся сваімі рукадзельніцамі — палатка, падавалася, ад нізу да верху была ўвешана вышытымі ручнікамі. Прычым такімі, якія можна ўбачыць толькі ў гэтым рэгіёне, бо ў розных кутках краіны і ручнікі выглядаюць па-рознаму, дзялілася сакрэтамі майстрыха Таццяна Петух, нават на свяце не выпускаючы з рук спіц:

— Пастаўскія льняныя ручнікі — нияркія, спакойных тонаў. А галоўны наш узор — шматлікія зоркі.

Тут жа гледачам, якія стаміліся толькі ад сузірання, прапаноўвалі і актыўныя забавы ў духу народнага каларыту. Заданні вызначаліся па паварoце кола фартуны, дзе былі адзначаны ўсе месяцы. І на кожны прыпадала сваё асаблівае практыкаванне, цесна звязанае з фальклорам і гісторыяй. Ліпень — месяц Івана Купалы, значыць, трэба скакаць праз касцёр, але каб лішні раз не нерваваць пажарнікаў, абыходзіліся скакалкай, а верасень — час для збору другога хлеба, таму ўборку бульбы імітавалі праходам паміж кеглямі з завязанымі вачамі.



СЯРГЕЙ ЛАЗЮК

А пачалося свята з маштабнага арт-парада ўдзельнікаў, прычым у доўгім страі, дзе былі прадстаўлены ўсе вобласці, сышліся ўборы з усіх эпох і ўсіх саслоўяў. Таму можна было назіраць дзіўную карціну, як людзі ва ўборах сялян рабілі сэлфі з апранутымі ва ўборы шляхты і наадварот. Не заканчваўся паток жадаючых сфатаграфавацца і з апранутымі ў багатыя касцюмы Аляксеем Румам і Ксеніяй Вайспек з Ліды:

— Мы прадстаўнікі гістарычнай анімацыйнай групы, пакуль безыменнай. У асноўным, працуем у Лідскім замку — праводзім паказальныя баі, кожную суботу арганізуем пляцоўку з рыцарскімі забавамі. На парадзе мы таксама паказвалі бой, які звычайна ставім перад турыстамі, хоць у замку мы звычайна выступаем у кальчугах і шлемах. Касцюмы, у якіх мы прыехалі сёння, можна аднесці да XIV-XV стагоддзя, але яны не зусім гістарычныя, проста прыгожа выглядаюць. У наступным годзе таксама абавязкова прыедзем на парад, але ўжо з назвай нашай групы.

І гэта яшчэ адзін знак таго, што "Дзень вышыванкі" становіцца традыцыйным святам, і праз год пляцоўка каля Палаца спорту ізноў напоўніцца народным каларытам.

Аляксандр **Піменаў**

# Смачныя вандроўкі

## Гастранамічныя фестывалі набываюць усё большую папулярнасць




**Многія падарожнічаюць па свеце толькі дзеля таго, каб адчуць смак сапраўднай італьянскай піцы, літоўскіх цэпелінаў, французскіх круасанаў... Кожная краіна можа пахваліцца ўнікальнымі кулінарнымі рэцэптамі. А ў Беларусі на гэта здольны кожны рэгіён. Тут вас не толькі дранікамі накормяць, але і прапануюць бліны, спечаныя на калодзе, бульбянікі з варанай бульбы і крупнік на гарэлцы. Дзякуючы апантаным і неабыякавым беларусам у нашай краіне можна ўжо гаварыць пра цэлую плынь гастранамічных фестываляў з кірмашамі, кулінарнымі майстар-класамі, канцэртамі.**

### “Пробуйтэ на здороўе”

**ШТО: “Мотальскія прысмакі”**
**ДЗЕ: аг. Моталь, Іванаўскі раён, Брэсцкая вобласць**
**КАЛІ: жнівень**

Італьянскі кулінарны крытык Рэната Кучынота пасля наведвання мотальскага фестывалю зрабіў выснову: “Маталяне — шчаслівчыкі, бо яны ядуць лепш, чым у сталіцы”. Яшчэ б! Ці пададуць вам у Мінску рульку, вытрыманую ў печы некалькі гадзін, кашу ў гарбузе, бульбяную таркаванку з сушанымі яблыкамі або мяса, запечанае ў хлебе? Яшчэ ў часы атрымання Магдэбургскага права ў 1555 годзе Моталь славіўся самабытнай кухняй і шчырымі гасціннымі людзьмі, майстрамі на ўсе рукі. Яны і жнуць, і ткуць, і печы кладуць, і лепшыя ў акрузе кажушкі выраблююць. І ўсе — ад старога да малога — захоўваюць мясцовы дыялект. Нават турысты з іншых краін заўважаюць, што па прыгажосці мотальскую гаворку можна параўнаць з французскай ці італьянскай.


БЕЛТА

Усё больш гасцей збірае фестываль “Мотальскія прысмакі”, які ладзіцца з 2008 года. Аграгарадок на 4 тысячы жыхароў здольны здзівіць не горш за еўрапейскія сталіцы — і апетытнымі стравамі, і забавамі. Падчас фестывалю на вуліцах з’яўляюцца паўліны з мясной нарэзкі, каралі з каўбасак, макеты храмаў з сала. Аднойчы мотальскія майстры-самавучкі нават умудрыліся выкласці з каўбасных кавалачкаў партрэт Моны Лізы! “Пробуйтэ на здороўе!” — кажуць тут. Але ж за прысмакамі трэба не забыцца наведаць мотальскую хатку, дзе нарадзіўся першы прэзідэнт Ізраіля Хаім Вейцман, музей народнай медыцыны “Бабуліны вышкі” ў вёсцы Стрэльна, а таксама Дастоева, адкуль паходзіць род пісьменніка Фёдара Міхайлавіча Дастаеўскага.




## Залатыя галовы

**ШТО: "Гаспадарчы сыр"**
**ДЗЕ: г. Слаўгарад, Магілёўская вобласць**
**КАЛІ: 30 красавіка**

Беларускія вытворцы спрабуюць паўтарыць замежныя пармезан, рыкоту, маскарпоне... Але наўрад ці гэтыя сырныя "рэпрадукцыі" змогуць параўнацца з традыцыйнымі сырамі, якія прапануюць на кулінарным форуме "Гаспадарчы сыр" у Слаўгарадскім раёне. На сёлетнім фестывалі мясцовыя сыравары прадставілі на суд гасцям больш за 50 відаў натуральных сыроў на любы густ: цвёрдыя і мяккія, плаўленыя і тварожныя, сырніцу і сырныя аладкі, салодкія і салёныя, з рознымі заправамі і напаўняльнікамі. Не кожны гіпермаркет можа пахваліцца такім багаццем. На фестывалі можна не толькі пачаставацца, але і самому навучыцца варыць сыр.



Нягледзячы на назву, слаўгарадскі фестываль прысвечаны не толькі сырам. У праграме свята — канцэрты мясцовых творчых калектываў, тэматычныя экскурсіі, гульні і конкурсы, кірмаш сувенірнай прадукцыі, паходная лазня, пешаходныя і конныя прагулкі і нават начлег у намётавым мястэчку. Той, хто жадае атрымаць ад паездкі на Слаўгарадчыну як мага больш эмоцый, можа наведаць мемарыяльны комплекс у аграгарадку Лясная, папіць цудадзейнай вадзіцы з "Блакітнай крыніцы", якая з'яўляецца помнікам рэспубліканскага значэння, а таксама сплавіцца на байдарках па Сожы.



## Вішні ад Мюнхгаўзена

**ШТО: Вішнёвы фестываль**
**ДЗЕ: г. Глыбокае, Віцебская вобласць**
**КАЛІ: чэрвень**

Глыбоччына ніколі не скардзілася на недахоп турыстаў. Тут ёсць што паглядзець: кафедральны сабор Раства Святой Багародзіцы XVII стагоддзя і Троіцкі касцёл XVIII стагоддзя, магіла вядомага мастака Язэпа Драздовіча, музей авіяканструктара Паўла Сухога ў Глыбокім, Мосарскі касцёл і найпрыгажэйшы культурна-дэндралагічны комплекс вакол яго... А ў 2013 годзе з'явіўся яшчэ і Вішнёвы фестываль, на які прыязджаюць цэлымі сем'ямі з розных куткоў Беларусі і замежжа. Вядома, з'явіўся небеспадстаўна — дамы глыбачан не адно стагоддзеззяюць у атачэнні "чырвоных рубінаў". Па вішні ў Глыбокае прыязджаюць і з суседніх раёнаў, і з Мінска.

Згодна з павер'ямі, вішні ў Глыбокае завезлі ці то манахі, ці то мясцовы селекцыянер Баляслаў Лапір, ці то сам барон фон Мюнхгаўзен. Так-так, той самы, што спрабаваў забіць аленя вішнёвай костачкай. Канешне, апошні варыянт больш падобны на жарт, аднак на мясцовых могілках і сёння можна ўбачыць стары двухметровы чыгунны крыж, на якім напісана прозвішча фон Мюнхгаўзена.

Падчас першага Вішнёвага фестывалю ў цэнтры Глыбокага ўсталявалі скульптуру ў выглядзе стылізаванага ствала і галінкі спелых вішань. Яна тут жа абрасла добрымі павер'ямі: хочаш шчасця — пагладзь самі ягадкі, грошай — патры лісточкі, роўнай і гладкай жыццёвай дарогі — правядзі далонню па галінцы. Пасля чатырох Вішнёвых фестываляў скульптура аж бліскучыць ад дотыкаў рук шматлікіх турыстаў.

Людміла **Мінкевіч**

## Дарэчы

Падарожнічаць па краіне са смакам стала працей — летась з'явілася гастранамічная карта Беларусі. Яе стваральнікі перадолелі 4 тысячы кіламетраў, правялі 66 гадзін у дарозе, пакаштавалі 30 унікальных страў і 28 аўтэнтычных прадуктаў, каб аб'яднаць у адной карце ўсё самае культавае і смачнае, — ад вугра з вёскі Мурашкі і шапавальскага мёду на Віцебшчыне да аленіны з Налібоцкай пушчы і мармуровага мяса з Турава.



ВАДЗІМ КАНДРАШОЎ

# Містыка, дый толькі

**Вас прыцягваюць гісторыі замкаў Дракулы і графіні Баторы, загадкавыя Стоўнхендж і возера Лох-Нес, якія халодзяць кроў? Тады прыязджайце да нас.**

## Круцейшы, чым Каспер

Самыя вядомыя беларускія прывіды — Чорная Панна Нясвіжа і Белая Панна Гальшан. Гісторыя пра першую жыве ў старажытным Нясвіжы ўжо больш за 400 гадоў. Згодна з ёю, вялікі літоўскі князь, а потым і кароль польскі Жыгімонт II Аўгуст закахаўся ў прыгажуню Барбару Радзівіл. Каханне было ўзаемнае і магло б ператварыцца ў шчаслівую гісторыю для нашчадкаў. Закаханыя нават таемна абвянчаліся. Аднак маці Жыгімонта каралева Бона Сфорца была супраць гэтага шлюбу, і, па легендзе, менавіта яна атруціла Барбару. Кароль не знаходзіў сабе месца пасля яе смерці і, каб хоць неяк палегчыць свой смутак, запрасіў алхімікаў выклікаць дух каханай. Тыя пагадзіліся, але загадалі ні ў якім разе не кранаць прывіда. Калі з'явіўся прывід Барбары, Жыгімонт забыў пра абяцанне і са словамі "Басенька мая!" кінуўся яе абдымаць. Раздаўся выбух, пайшоў трупны пах, і прывід знік.

Цяпер Барбара блукае па замку ў чорным адзенні ў знак жалобы па сваім загубленым каханні, не знаходзячы дарогу ў магілу. Гавораць, яна з'ўляецца пераважна перад няшчасцямі, каб папярэдзіць пра іх. Напрыклад, яе бачылі ў 2002 годзе, калі згарэла большая частка замка.



У Белай Панны з Гальшан свая трагічная перадгісторыя. Падчас узвядзення побач з замкам францысканскага манастыра будаўнікі сутыкнуліся з незразумелай праблемай: адна са сцен пастаянна разбуралася. Вырашыўшы, што гэтае месца праклятае, яны вырашылі правесці магічны абрад ахвярапрынашэння — замураваць у сцяну жывую жанчыну. Горкая доля спасцігла жонку аднаго з будаўнікоў, якая першая прынесла абед мужу. З тых часоў Белая Панна блукае па Гальшанах, часцяком з'яўляючыся мясцовым жыхарам і прыезджым, асабліва тым, хто асмельваецца переначаваць у манастыры. Відавочцы расказваюць, што бачылі адбітак Белай Панны ў люстэрку, яе напаўпразрыстыя рукі, якія вырастаюць са сцяны, і гэтак далей. Гавораць, асабліва недалюбліва прывід мужчын — пры выглядзе яе яны сівеюць і губляюць арыентацыю ў прасторы.

Яшчэ адна жанчына-прывід жыве ў Лошыцкай сядзібе ў Мінску. Яе можна ўбачыць побач з незвычайным для нашай мясцовасці дрэвам маньчжурскага абрыкоса ў дні яго

красавання, якія супадаюць з поўняй. Лічыцца, што гэты прывід Ядвігі, жонкі гаспадара Лошыцкай сядзібы Яўстафія Любанскага. Аднойчы пасля сваркі з мужам яна пайшла ў засмучаных пачуццях да ракі, а на наступны дзень яе цела знайшлі ў вадзе. Дагэтуль невядома, як яна патанула — па сваёй волі ці ёй нехта дапамог гэта зрабіць. Пасля гэтай трагедыі Яўстафій загадаў залажыць акно пакоя Ядвігі цэглай і пакінуў сядзібу. А перад ад'ездам пасадзіў у парку маньчжурскі абрыкос, каля якога цяпер і з'яўляецца прывід Ядвігі. Дарэчы, убачыць яго, хутчэй, не на бяду, а на ўдачу — маўляў, Ядвіга здольная дапамагчы ў любоўных справах.

## Жывыя крыжы

Многія чулі пра тураўскія крыжы на Гомельшчыне, якія растуць з-пад зямлі. Пра першы з іх загаварылі ў 1980-я гады, калі паміж дзвюма магілкамі з'явіўся камень. Яго спрабавалі перамясціць, каб не перашкаджаў праходу, але не здолелі гэтага зрабіць і пакінулі ў спакоі. А ён з тых часоў працягвае расці — сёння вышыня каменя складае каля 40 сантыметраў. Праўда, не ўсіх сустракае аднолькава — адных ахоплівае цяплом, іншых б'е токам. Але цудаў вакол яго адбылося ўжо нямала: у бяздзетных сем'ях нараджаліся малыя, хворыя вылечваліся, дзяўчаты, якія доўга марылі сустрэць каханне, знаходзілі яго. А ў 2008 годзе ў тураўскага крыжа з'явіўся "брат" — на месцы Барысаглебскай царквы ў Тураве. Спачатку з'явіўся маленькі камень, а потым у яго пачалі расці "крылы".

Менш вядомыя, але не менш уражлівыя крыжы растуць і ва Ушацкім раёне. У ліку першых пра іх напісала ў 2011 годзе "Народная газета". Прыехаўшы разам з гідамі на могілкі, якія знаходзяцца за 25 кіламетраў ад райцэнтра ў вёсцы Замошша, наш карэспандэнт убачыла ў густым лясочку камяні розных формаў і памераў, якія "вылазяць" з-пад моху. Аказалася, да пачатку 2000-х ніхто і не падазраваў, што ў гэтым месцы знаходзяцца могілкі. Іх заўважыла мінчанка, якая набыла ў Замошшы ўчастак для лецішча. Знаёмячыся з наваколлямі, яна натрапіла на лясны ўчастак, дзе то тут, то там "прарасталі" камяні — як высветлілася пазней, старажытныя помнікі XII-XV стагоддзяў. Цяпер некаторыя з іх ростам з чалавека! Навукоўцы спрабуюць растлумачыць анамалію перападамі тэмператур у глебе, але ў мясцовых жыхароў тлумачэнне адно: гэтыя крыжы — знак Божы.

## У госці да Лепельскага Цмока

У Мірскі замак большасць прыязджае атрымаць асалоду ад архітэктуры і духу гісторыі. А некаторыя — па містычныя легенды, звязаныя ў першую чаргу з сажалкай ля замка. Гавораць, каб стварыць гэты вадаём у канцы XIX стагоддзя, гаспадар замка Мікалай Святаполк-Мірскі загадаў высечы квітнеючы сад. Мясцовыя жыхары разумелі, што секчы квітнеючы сад нядобра, але гэта не спыніла ўладальніка. Падчас высечкі саду і капання сажалкі загінула нямала людзей. Маці аднаго з іх, якая, паводле легенды, была сапраўднай ведзьмай, прыйшла да Святаполка-Мірскага і пракляла і яго, і сажалку, сказаўшы, што цяпер у ёй будуць гінуць людзі — па адным за кожнае ссечанае дрэва. Першай ахвярай стала 12-гадовая Сонечка — дачка Мікалая Святаполка-Мірскага. А праз некалькі гадоў патануў у гэтай сажалцы і ён сам.

А Лепельскае возера на Віцебшчыне — наогул беларускі варыянт Лох-Неса. Менавіта тут, па запэўніваннях мясцовых жыхароў, а таксама класіка беларускай літаратуры і знатака нашай гісторыі Уладзіміра Караткевіча, жыве Цмок — фантастычная істота, падобная да цюленя з галавой лані, плаўнікамі і доўгай шыяй. Ходзяць легенды, што Цмок і цяпер часам выходзіць з глыбіні возера, ператвараецца ў прыгожага хлопца і заляцаецца да дзяўчат. А калі яны дрэнна сябе паводзяць, карае. Аднак па сутнасці сваёй Цмок не такі ўжо і дрэнны. У беларускай міфалогіі ён лічыцца не толькі рэгулятарам вод, але і апекуном сям'і. Пары, якія жывуць у згодзе і каханні, заўсёды могуць разлічваць на яго падтрымку. Напэўна, таму столькі гасцей збірае штогод фестываль міфалогіі "У госці да Лепельскага Цмока". І калі сапраўднага азёрнага Цмока ўбачыць не атрымаецца, пагладзіць яго скульптуры ў горадзе дакладна ўдасца.

Міфічнымі істотамі багата яшчэ адно возера ў Віцебскай вобласці, якое знаходзіцца ў лясочку недалёка ад Гарадка. Кажуць, сам д'ябал утапіў у ім царкву, і цяпер з яго дна трапляюць прама ў пекла. А дапамагаюць у гэтым мясцовыя русалкі — яны завабліваюць падарожнікаў і топяць у возеры. Галоўнае — пры сустрэчы з русалкамі не паддацца гіпнозу іх бяздонных блакітных вачэй. Для гэтага трэба ўстаць у намаляваны на зямлі круг, у якім павінен быць напісаны крыж, або ж хутчэй сказаць: "Цур мая!" Тады русалка пойдзе з вамі дадому і стане працавітай гаспадыняй. Што ж, добры фінал пужлівай гісторыі...

Вольга **Карнеева**





# Не за трыдзевяць зямель



## Беларусь — скарбніца ўнікальных помнікаў, прыродных цудаў і традыцый, пра якія многія нават не падазраюць

Пры наяўнасці сродкаў сёння не праблема падарожнічаць па свеце. Многія ўжо пабывалі ў розных краінах і захоплена дзеляцца ўражаннямі. А спытай пра беларускія славутасці, большасць у лепшым выпадку назаве тыя, што на слыху: Мірскі і Нясвіжскі замкі, Белавежскую пушчу, Брэсцкую крэпасць... Маўляў, і пахваліцца асабліва няма чым. Але не варта прыбядняцца. Толькі ў Дзяржаўны спіс гістарычна-культурных каштоўнасцяў Беларусі ўключана больш за 5000 аб'ектаў!

### Крэва — Гальшаны

Гэтае маленькае падарожжа на поўнач Гродзеншчыны пераносіць турыстаў адразу на некалькі стагоддзяў назад. Менавіта ў Крэўскім замку была заключана вядомая Крэўская унія, якая паклала пачатак аб'яднанню Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага. Тут па загадзе вялікага князя Ягайлы быў задушаны яго дзядзька Кейстут, і адсюль уцёк, пераапрануўшыся ў жаночую сукенку, яго стрыечны брат Вітаўт. Сёння ад замка захаваліся толькі руіны, але яны памятаюць усе падзеі, якія адбываліся, таму так лёгка прадставіць іх і турысту, які знаходзіцца ў Крэве.

У Гальшанах стан замка не больш суцяшальны. Затое якая рамантычная атмасфера! Пашанцуе, калі вы выберацеся сюды падчас фестывалю "Гальшанскі замак" — сёлета ён прайшоў 20 мая. Калі вакол гучыць сярэднявечная музыка, расхаджваюць дамы ў гістарычных касцюмах і рыцары з мячамі, а на тэатральнай сцэне з'яўляецца сам Ягайла з Соф'яй Гальшанскай, падаецца, што няма ні руін, ні XXI стагоддзя — усё, як і шмат стагоддзяў назад.



### Віцебск — Здраўнёва

Віцебск прыцягвае да сябе ўвагу не толькі ў дні "Славянскага базару". Тут многае ўражвае — гістарычная забудова, якая захавалася да нашых дзён, грацыёзная ратуша, манументальны Палац губернатара, у якім спыняўся Напалеон Банапарт, велічныя храмы.

Аматары мастацтва абавязкова павінны наведаць музей Марка Шагала. А як не зазірнуць у сядзібу Ільі Рэпіна ў Здраўнёве, якая знаходзіцца за 16 кіламетраў ад горада. Там можна ўбачыць рэчы з ужытку сям'і мастака, пагуляць пад ліпамі, пасаджанымі самім Ільёй Яўфімавічам.

### Парк гісторыі "Сула" — Рубяжэвічы

Падарожжа ў сядзібна-паркавы комплекс "Парк гісторыі "Сула", які знаходзіцца за 49 кіламетраў ад Мінска, — лепшае за любую камп'ютарную гістарычную гульню. Тут на месцы сядзібы шляхецкага роду



Ленскіх вы зможаце паўдзельнічаць у будаўніцтве замка, паназіраць за коўкай халоднай зброі ў зброевай майстэрні, пакатацца на дракары вікінгаў, убачыць залу рыцарскай славы са зборам габеленаў і карцін, паслухаць жывое гучанне валынкі-дуды і фісгармоніі XVIII стагоддзя, развучыць гістарычны танец, прадэгуставаць традыцыйныя беларускія стравы і напоі.

У Рубяжэвічах (Стаўбцоўскі раён) — мястэчку, якое неаднаразова аказвалася ля мяжы то адной, то другой дзяржавы, можна купіць карысную гарбату ў старой аптэцы лячэбных траў, названай "беларускай фіталячэбнай Меккай", а таксама паслухаць арган у касцёле Святога Іосіфа.

## Магілёў — Буйніцкае поле — Бабруйск

Магілёў багаты архітэктурнымі помнікамі: тут і найпрыгажэйшая ратуша, і самы стары ў краіне кінатэатр, і незвычайная скульптура астролага... Але ёсць што паглядзець і ў наваколлях горада. Для аматараў традыцый — этнаграфічная кампазіцыя "Беларуская вёска", для знатакоў ваеннай гісторыі — Буйніцкае поле. Мемарыял, звязаны з драматычнымі падзеямі першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны, здзівіць экспазіцыяй ваеннай тэхнікі. Тут па завяшчанні пісьменніка Канстанціна Сіманава быў развеяны яго прах.



Яшчэ адзін знакавы ваенна-гістарычны аб'ект сустрэнуць турысты ў Бабруйску — мясцовая крэпасць здзіўляе веліччу і магутнасцю. Знакаміты горад і сваёй яўрэйскай гісторыяй. У пачатку XX стагоддзя яўрэі складалі больш за палову яго насельніцтва, цяпер — менш за 1 працэнт. Аднак і сёння можна наведаць сінагогу, паспрабаваць кашэрнай ежы і паслухаць вядомую яўрэйскую мелодыю "7:40", якая даносіцца з вежавага гадзінніка.

## Мазыр — Тураў — Ляскавічы

Для аматараў прыроды няма лепшай паездкі, чым на Палессе. Жадаеце прайсці сапраўдны курс "палесатэрапіі"? Звяртайцеся па дапамогу ў адміністрацыю Нацыянальнага парку "Прыпяцкі" ў Ляскавічах, дзе вам прапануюць і Музей прыроды, і сафары-парк, і прагулку па рачных джунглях, і плывучую гасцініцу, і баржу-рэстаран, не гаворачы ўжо пра ўсе віды рыбалкі і палявання. Аднак славяцца гэтыя месцы не толькі непаўторнай прыродай. У гістарычна-археалагічным комплексе "Старажытны Тураў" пад шкляным шатром можна ўбачыць рэшткі каменнага храма, разбуранага землятрусам 1230 года. Толькі ўявіце: камяні, плінфа, рэшткі царкоўнага звона і нават знойдзеныя ў развалінах храма каменныя саркафагі амаль 800-гадовай даўнасці — усё гэта можна ўбачыць на свае вочы.

## Пінск — Кобрын



Гэта маршрут для тых, хто за адзін уік-энд жадае пазнаёміцца адразу з некалькімі культурамі, а можа, і эпохамі. У Пінску гарманічна спалучаюцца сучасныя гасцініцы з будынкамі XVIII-XIX стагоддзяў, мірна існуюць цэрквы, касцёлы і сінагогі. Каларытна ляжыць польскі люк Wegerska gorka на беларускай вулачцы Завальная і смачна пахне ўспамінамі ў былой яўрэйскай пякарні на вуліцы Леніна. Любы турыст знойдзе тут адпачынак па душы: можна пракаціцца на байдарках і адправіцца ў міні-круіз на цеплаходзе, парыбачыць і павячэраць на караблі, убачыць беларускую экзотыку накшталт драўлянага ровара і дубовых чаўноў у мясцовым музеі, зазірнуць у дом, дзе жыў Напалеон Орда і пазнаёміцца з пякарняй дзядзькі прэзідэнта Microsoft Стыва Балмера.

Неверагоднай талерантнасцю здзівіць і Кобрын, дзе суседнічаюць велічныя храмы розных канфесій XVII-XIX стагоддзяў. Наведваючы гэты горад, абавязкова зазірніце ў Музей Суворава. А яшчэ — на страусіную ферму ў наваколлях Кобрына — самую вялікую ў СНД.

Людміла **Мінаковіа**

# Сінявокая чароўнасць Беларускага Паазер'я



СЯРГЕЙ ПЛЫТКЕВІЧ

**У любым рэгіёне Беларусі можна адшукаць куткі першароднай прыроды — захоўваць іх дапамагае асаблівы статус, якім яны надзелены. Прапануем здзейсніць "паказальную прагулку" па Віцебшчыне.**

## Мядзведжымі сцежкамі

Большая частка Віцебскай вобласці пакрыта лясамі, дзе прывольна сябе адчувае разнастайная дзічына. Паўночна-заходні рэгіён называюць Беларускім Паазер'ем — там безліч найпрыгажэйшых азёр, багатых рыбай.

Асаблівай увагі заслугоўвае Бярэзінскі біясферны запаведнік. Дарэчы, ён адзіны ў краіне мае вышэйшы прыродаахоўны статус. Запаведнік уключаны ў Сусветную сетку біясферных рэзерватаў міжурадавай праграмы ЮНЕСКА "Чалавек і біясфера". Асноўная яго каштоўнасць — вялізны, плошчай каля 70 тысяч гектараў, суцэльны масіў некранутых лясоў. Вялікую каштоўнасць, асабліва для мігруючых птушак, уяўляе пойменны комплекс Бярэзіны. Тут пад аховай знаходзіцца мноства рэдкіх і знікаючых відаў раслін і жывёл. Амаль два дзясяткі балотных масіваў плошчай ад некалькіх сотняў да дзесяці тысяч гектараў, звязаных разгалінаванай сеткай малых лясных ручаёў і рэчак, утвараюць адзіны водна-балотны комплекс. Дзякуючы гэтым прыродным асаблівасцям запаведнік уключаны ў спіс Рамсарскіх угоддзяў — ахоўных водна-балотных тэрыторый, якія маюць важнае міжнароднае значэнне.

З Мінска да запаведніка ўсяго дзве гадзіны язды. Яго цэнтральная сядзіба знаходзіцца ў вёсцы Дамжэрыцы (за 3 км ад шашы Мінск — Віцебск). Для турыстаў распрацаваны найцікавейшыя маршруты, разлічаныя на любую пару года. Да прыкладу, увесну тут можна паслухаць такаванне цецерукоў, а ўвосень — кліч равучага аленя.

Апошнім часам набіраюць папулярнасць фотасафары. Можна здзейсніць пешую, веласіпедную, конную прагулку, наведаць Музей прыроды. Дзікіх жывёл у запаведніку шмат, але яны, зразумела, не чакаюць турыстаў на маршруце. Затое ёсць магчымасць паглядзець на іх у вальерах, дзе ўтрымліваюцца казулі, алені, кабаны, зубры, ваўкі, мядзведзі ды іншыя прадстаўнікі мясцовай фауны. Дзеці ў захапленні ад экскурсій Балотніка — міфічнага персанажа, сваяка Лесуна і Кікімары. Улетку ён экскурсавод, а ўзімку — Дзед Мароз.



## З варагаў у грэкі

Частка гістарычнай спадчыны краю — легендарны гандлёвы водны шлях, па якім у X-XII стагоддзях варагі-вікінгі са Скандынавіі траплялі ў Канстанцінопаль: па Заходняй Дзвіне, Дняпры і Чорным моры. Аматары водных падарожжаў спрабуюць паўтарыць шлях адважных продкаў. Асаблівай папулярнасцю карыстаецца сплаў на байдарках. Але да такіх “круізаў” гатовы не кожны, таму прасцей убачыць хараство беларускай поўначы, праехаўшы ўздоўж Заходняй Дзвіны на аўтамабілі. Балазе беларускія дарогі дазваляюць зрабіць гэта з камфортам.

## Вандроўны востраў

З першага погляду ўлюбляешся ў возера Асвейскае ў Верхнядзвінскім раёне. Пасля Нарачы гэта другое па велічыні беларускае возера (плошча 52,8 км²). Калі пашанцуе, можна ўбачыць і вялікі плывучы востраў.

Немагчыма выпусціць з-пад увагі і ландшафтны заказнік “Ельня”, які займае частку Міёрскага і Шаркоўшчынскага раёнаў. Ельня — найбуйнейшае ў Еўропе верхавое балота, якое захавалася ў першародным выглядзе.

## Беларускія карані “Пунсовых ветразяў”

Падарожжа ў свет прыроды можна сумясціць са знаёмствам з іншымі славутасцямі. Да прыкладу, у Верхнядзвінскім раёне шмат прыгожых храмаў. Велічны неагатычны касцёл у Сар’і здзіўляе ажурнасцю і магутнасцю. А касцёл у Росіцы дагэтуль выклікае спрэчкі — неаготыка гэта ці неараманскі стыль?

На Верхнядзвіншчыне знаходзіцца і самы маленькі горад Беларусі — Дзісна, у ім пражывае крыху больш за паўтары тысячы чалавек. У горада багатая гісторыя: на вялікім востраве, дзе ў Заходнюю Дзвіну ўпадае Дзісна, сяліліся старажытныя людзі. У часы Івана Грознага сярод вод стаяў замак, узведзены Стэфанам Баторыем. Абарончыя валы захаваліся да нашых дзён. У савецкія часы тут здымалі такія вядомыя фільмы, як “Дзяржаўная граніца”, “Людзі на балоце”, “Чорная бяроза” ды іншыя.

Некалі гэты горад быў цэнтрам гандлю на беразе вялікай суднаходнай ракі. Пра тыя часы нагадваюць тыпова купецкія цагляныя будынкі і брукаваныя каменем дарогі. У Дзісне захаваліся домік бацькі вядомага пісьменніка Аляксандра Грына і самы стары дзеючы чыгуначны мост цераз раку.

## Нічога сабе “прас”!

У Віцебскай вобласці налічваецца 70 геалагічных помнікаў рэспубліканскага значэння, у тым ліку “Вялікі камень” — самы буйны валун на тэрыторыі Беларусі. Ён знаходзіцца побач з вёскай Горкі, за 15 кіламетраў ад г.п. Шуміліна і за 17 кіламетраў ад г.п. Бешанковічы. Яго даўжыня — 11 метраў, шырыня — 5,6 метра, даўжыня па перыметры— 28,2 метра. Частка валуна знаходзіцца пад зямлёй, таму яго сапраўдныя памеры значна большыя, а над зямлёй ён узвышаецца на 2,8 метра. Важыць волат некалькі сотняў тон. Знешне з аднаго з бакоў валун нагадвае гіганцкі прас. Ёсць у яго і неафіцыйная назва — Чортаў камень. Старажытнае паданне гаворыць: калі падысці да каменя ў бязмесячную ноч, то да світання будзеш кружыць вакол яго. Людзі верылі, што пад гэтым валуном нячыстая сіла хавае скарбы.

Характэрна, што менавіта шумілінскія валуны выкарыстоўваліся пры будаўніцтве Сафійскага сабора ў Полацку.



## У нас яна адна такая

Адзіная ў Беларусі пячора знаходзіцца на стромкім беразе возера Гінькава каля вёскі Сахновічы Глыбоцкага раёна. Яна ўтварылася ў рэліктавым пясчаніку, узрост пластоў якога складае каля 25 тысяч гадоў. Глыбіня пячоры — каля 10 метраў. Як гаворыць легенда, у ёй былі схаваныя скарбы варшаўскіх шляхцянак пасля падзелу Рэчы Паспалітай. І скарб Напалеона. Але куды што падзявалася, невядома...

Герман **Маскаленка**

# Крычаў шмат пабачыў...



WWW.TUT.BY

**Гарадок на Сожы — адзін з самых старажытных на Магілёўшчыне. Упершыню пад назвай Крэчут ён згадваецца ў "Статутнай грамаце".**

## Пагасцяваць у князя Пацёмкіна

У канцы XII стагоддзя на месцы старажытнага гарадзішча пабудавалі замак. "Камяніцу" разбурылі ў гады Паўночнай вайны. Сёння ад былой велічы застаўся толькі падмурак адной з вежаў. Гісторыя краю цесна звязана з іменем фаварыта Кацярыны Вялікай князя Рыгора Пацёмкіна — імператрыца падарыла яму тутэйшыя землі. Перш за ўсё гаспадар выбудаваў палац у форме літары "Е". Яго называюць малодшым братам Таўрыйскага палаца ў Санкт-Пецярбурзе. Абодва будынкі праектаваў Іван Староў. Дакладна вядома, што царыца там паспела пагасцяваць. Цяпер пацёмкінскі палац — галоўная славутасць Крычава. Большую частку залаў займае краязнаўчы музей.

## Даведацца пра гісторыю беларускага Робін Гуда

На ўездзе стаіць драўляная скульптура — воін з крыжом у руцэ і шабляй на поясе. Гэта не хто іншы, як Васіль Вашчыла — кіраўнік паўстанцаў, які называў сябе ўнукам Багдана Хмяльніцкага. Сабраўшы сялян навакольных вёсак, Вашчыла выступіў супраць прыгнёту аднаго з найбагацейшых магнатаў Вялікага Княства Літоўскага Ераніма Радзівіла, якому тады належаў Крычаў. У сутыкненнях з рэгулярнымі армейскімі часцямі сялянскае апалчэнне пацярпела паражэнне. Васіль уцёк у Расію, дзе і памёр. Гэта Радзівіл зваў яго бандытам, а ў гісторыю ён увайшоў як народны заступнік — беларускі Робін Гуд.




Помнік беларускаму Робін Гуду — Васілю Вашчылу

ПАВЕЛ МІНЧАНКА






Пацёмкінскі палац у Крычаве стаў месцам правядзення традыцыйных бальных сезонаў

## Выпіць гаючай вадзіцы з Пятровай крыніцы

Мясцовыя вуліцы цікавыя тым, што захавалі планіроўку, падобную да рускіх павятовых гарадкоў XIX стагоддзя. Засталіся жылыя дамы, пабудаваныя сто і больш гадоў назад. У Крычаве многае звязана з гісторыяй дзяржавы Расійскай. Пятрова крыніца на Пятровым лузе — так мясцовыя жыхары называюць крыніцу на ўскраіне горада, побач з якой у 1708 годзе знаходзіўся паходны лагер Пятра Першага. Тады пад Крычавам каля вёскі Маляцічы перадавыя атрады рускіх войскаў сустрэліся са шведамі, прымусіўшы іх уцякаць.



## Прайсці па слядах Ганібала і Афанасія Нікіціна

Стрыечны дзед Аляксандра Пушкіна генерал Іван Ганібал, быўшы інжынерам, будаваў у горадзе суднаверф на рацэ Сож. Яна пачала дзейнічаць у 1785 годзе і была адной з самых буйных у Расіі. Усяго тут спусцілі на ваду 25 парусных і вёсельных суднаў для Чарнаморскага флоту. Магчыма, Крычаў стаў апошнім прыстанкам вялікага падарожніка Афанасія Нікіціна, які схадзіў пешшу за тры моры ў Індыю ў канцы XV стагоддзя. Дзе пахаваны Нікіцін, невядома. Паводле дакументаў, вяртаючыся з земляў заморскіх, ён памёр недзе пад Смаленскам — на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага. Беларускія краязнаўцы мяркуюць, што адбылося гэта ў Крычаве. Гістарычныя хронікі гавораць, што Нікіцін менавіта там перадаў купцам, якія ехалі ў Маскву з Крыма, свае знакамітыя запіскі, вядомыя сёння ўсяму свету.

## Папрацаваць станцыйным наглядчыкам

Паштовая станцыя ў мястэчку Крычаў з'явілася ў сярэдзіне XIX стагоддзя. Тады гэта было важнае скрыжаванне на гасударавым гасцінцы з Масквы ў Варшаву. Аднапавярховы будынак, вуглы якога выдзелены пілястрамі, а сцены — арачнымі нішамі. Прамавугольныя вокны ўяўляюць сабою спічастыя аркі. Шкада, да нашых дзён не ацалелі станцыйныя стайні, якія некалі былі часткай комплексу. Але затое ў Крычаве можна ўбачыць, як выглядалі каменныя стайні графскай сядзібы. Мяркуючы па багатай ляпніне, гаспадары маёнтка ў конях душы не чулі. Старадаўнія традыцыі жывыя на Крычаўшчыне і сёння — у стагоддзе матораў. У аграсядзібах раёна прапаноўваюць конныя прагулкі. І, вядома, увесь набор традыцыйнай беларускай гасціннасці: рыбалку, паляванне, лазню і багаты стол з дранікамі і мачанкай.

Святлана **Маркава**




Паштовая станцыя ў мястэчку Крычаў





Мясцовыя жыхары ўпэўнены: Хрыстос Збавіцель ля касцёла Пятра і Паўла абараняе горад ад бед і напасцяў



# 5 прычын пабываць у Іўі

**Гэты горад на Гродзеншчыне называюць неафіцыйнай сталіцай беларускіх татар. У знакамітай Грунвальдскай бітве аб'яднаных славянскіх палкоў супраць крыжакоў у 1410 годзе прымалі ўдзел і татары. Пасля чаго на Іўешчыне і з'явілася першае татарскае паселішча, дзе перасяленцы-магаметане атрымалі землі за свае заслугі.**

## Прайсціся па "сталіцы" беларускіх татар

**1** Навукоўцы запэўніваюць, што назва горада пайшла ад татарскага "оўэ, еве" — гняздо, жыллё. Мясцовыя жыхары расказваюць і свае легенды, звязаныя з тапанімікай. Вяльможная пані так любіла гэты край, што муж — князь літоўскі Гедымін — загадаў узвесці для каханай на ўзгорках ля ракі Івенкі замак. На гербе старажытнага горада адлюстравана княгіня Ева, адсюль і Іўе — горад Евы.

Калі татары атрымалі правы на шляхецтва, многія сталі жаніцца з мясцовымі красунямі-хрысціянкамі, браць беларускія імёны і прозвішчы. Пры гэтым засталіся верныя ісламу. Самая старая мячэць Беларусі знаходзіцца ў Іўі. Цікава, што ўзвялі яе ў 1882 годзе на сродкі ўладальніцы мястэчка, польскай графіні і шчырай каталічкі Эльвіры Замойскай.

Татарскай вуліцай сотні гадоў называлася цяперашняя Савецкая, дзе і знаходзіцца мячэць. Сам раён стагоддзямі меў татарскую назву Мураўшчызна. Непадалёк мусульманскія могілкі (мізар). Тут на надмагільных помніках — ісламскія паўмесяцы і арабская вязь. Побач з усходнімі імёнамі — тыпова беларускія прозвішчы. На камянях можна ўбачыць сімвал татарскіх сем'яў — паніклую галінку вярбы, з лісця якой капаюць слёзы.

Першая вясновая агародніна і зеляніна на беларускіх рынках — з Іўя. Менавіта перасяленцы з Крыма прыахвоцілі беларусаў да агародніцтва. Нават у Мінску ёсць раён Татарскія агароды. Першае, чым сустракае Іўе гасцей з боку Гродна, — вялікія цяпліцы, сапраўдныя джунглі агародніны.



Сінагагальны двор (пабудова канца XIX стагоддзя)



Манумент “У гонар дружбы і адзінства канфесій Іўеўшчыны”







Мячэць была пабудавана ў 1884 годзе на сродкі, дадзеныя каталічкай графіняй Эльвірай Аўгустаўнай Замойскай



Лепш за ўсё ехаць у Іўе ў Курбан-байрам ці на Ід аль-Фітр, каб паглядзець, як іх святкуюць.

## Убачыць манумент чатырох святыняў

**2** На цэнтральнай плошчы Іўя стаіць незвычайны манумент: чатыры аркі як пачатак шляху да чатырох святыняў: царквы, касцёла, мячэці і сінагогі.

Праваслаўны храм з залатымі купаламі-цыбулінкамі знакаміты сваім абразом Казанскай Божай маці. Рэліквію падарыў гораду ўраджэнец Іўешчыны Віктар Шутаў, які працаваў у Раскосмасе: абраз дзесяць дзён правёў на касмічнай арбіце.

У горадзе добра захаваўся двухпавярховы яўрэйскі квартал рамеснікаў і гандляроў. Тут жа будынак сінагогі традыцыйнай вядомай архітэктуры, цяпер у ім спартшкола. Падчас вайны ў гета загінула практычна палова жыхароў горада. У свята 9 Мая іх нашчадкі штогод прыязджаюць з усяго свету на мітынг-рэквіем.

## Паглядзець на “двайніка” Хрыста з Рыа

**3** Утульны правінцыйны горад жыве сваім ціхім і размераным жыццём. Назіраць за ім лепш за ўсё з узгорка, на якім узвышаецца касцёл Святых Пятра і Паўла, узведзены ў канцы XV стагоддзя. Войны і людзі моцна змянілі першапачатковае аблічча гатычнага касцёла. Сёння яго стыль — гэта мікс з элементаў рэнесансу, барока і ракако. На гэта варта паглядзець. Статуя Хрыста ў Іўі з’явілася крыху больш як дзесяцігоддзе назад. Незвычайная скульптура — як дзве кроплі вады падобная да знакамітага манумента Хрыста Збавіцеля ў Рыа-дэ-Жанейра. Вядома, яе памер значна саступае арыгіналу. Але да Рыа далёка, а Іўе — вось яно.

У Іўі і яго наваколлях нямала каменных касцёлаў, кожны з якіх можна змяшчаць на плакат. Напрыклад, неагатычны касцёл пачатку XX стагоддзя ў Суботніках. А ў Геранёнах захаваўся адзін з самых старых беларускіх касцёлаў — Мікалаеўскі (1519) — і руіны замка (XV-XVI стст.).

У Іўі турыстаў чакае Музей нацыянальных культур. Сярод экспанатаў — старажытныя Каран і Талмуд, іншыя культавыя святыні. Па адной з версій менавіта ў іўеўскай друкарні была выдадзена “Граматыка” Мялеція Сматрыцкага. Па ёй вучыўся Міхайла Ламаносаў, які называў яе варотамі сваёй вучонасці.

## Пабываць у каралеўскіх Лазенках

**4** Лазенкі ў Варшаве — знакамітая рэзідэнцыя апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста, вядомая як “палац на востраве”. Каб убачыць гэты шэдэўр архітэктуры, не абавязкова адпраўляцца ў Польшчу. Можна наведаць у Іўеўскім раёне невялікую вёску Жамыслаўе. Тут да нашых дзён захаваўся палацава-паркавы ансамбль з практычна дакладнай копіяй каралеўскіх Лазенак.

Наследаванне каралям тлумачыцца настальгіяй мясцовай шляхты па “цудоўных” часах Рэчы Паспалітай. Мясцовыя магнаты лічылі сябе раўнёй каралям. Сёння ад ранейшай раскошы — толькі архітэктура.

## Паўдзельнічаць у паляванні ў Налібоцкай пушчы

**5** Нацыянальны парк “Налібоцкая пушча” — жамчужына на турыстычнай карце краю. Бязмежныя лясы пачынаюцца практычна за горадам. У гады вайны ў пушчы базіраваліся магутныя партызанскія злучэнні. Сёння тут раздолле для паляўнічых: дзічыны хоць адбаўляй! Можна нават паўдзельнічаць у каралеўскім паляванні на фазана.

У вёсцы Залейкі ёсць сядзіба Зімніка — роднага брата Дзеда Мароза і бабы Завірухі (Мяцеліцы). Узімку сюды ў госці да казкі едуць сотні турыстаў з дзецьмі.

Герман **Маскаленка**

# Сіла кітайскага дракона



**Кітайская тэма ўсё шырэй займае розумы беларускіх навукоўцаў. І прадметам іх вывучэння становяцца не толькі беларуска-кітайскія адносіны ў розных сферах дзейнасці. Гісторыкі, палітолагі, эканамісты, філосафы імкнуцца зазірнуць у розныя стагоддзі кітайскай гісторыі і зразумець, як, за кошт якіх рэсурсаў Паднябесная, яе народ змаглі дасягнуць небывалых поспехаў, адолець многія палітычныя супярэчнасці і вырвацца далёка наперад. Пра тое, чым досвед Кітая можа быць цікавы для Беларусі, наша гутарка з палітолагам, кандыдатам гістарычных навук Віктарам Герменчуком, які займаецца даследаваннем мінулага і сучаснасці гэтай вялікай краіны.**

***— У Выдавецкім доме “Звязда” пабачыла свет ваша кніга “Кітай. Крылы Дракона”. Што падштурхнула да даследавання такога характару? Пра Кітай жа напісана ўжо так многа...***

— Сапраўды, шмат, але не заўсёды добра, асабліва па праблемах палітычнай мадэрнізацыі. Якраз пра гэта наша кніга. Візітная картка большасці даследаванняў пра стары і новы Кітай — неразгаданыя таямніцы Усходу. У выніку гістарычных абставінаў, сваёй “бліскучай ізаляцыі” гэтая краіна стала добра вядомая еўрапейцам толькі ў XVII-XVIII стагоддзях. Захапленне выклікала літаральна ўсё: амаль 5 тысяч гадоў гэтай найстаражытнай на зямлі цывілізацыі, вялікая тэрыторыя і колькасць насельніцтва, яе багацці, вытанчаная кітайская культура. Тады нікому і ў галаву не прыходзіла лічыць Кітай адсталай дзяржавай. Кітайская эканоміка вырабляла ў гэты перыяд прыкладна 30 працэнтаў сусветнага ВУП. Амаль ні ў чым краіна не саступала іншым дзяржавам у тэхналагічных і арганізацыйных адносінах. А ў палітычным плане Кітай нават пераўзыходзіў еўрапейскія дзяржавы.

Як вядома, вынаходства “Захаду”, заходняй цывілізацыі, належыць эпосе Асветніцтва. Але не ўсім вядома, што адкрыты выклік асветнікаў такім “ганебным з’явам” еўрапейскай рэчаіснасці, як прывілеі царквы і каралеўскай улады, абгрунтоўваўся спасылкамі на гісторыю кітайскай дзяржаўнасці. Менавіта Канфуцый стаў свяшчэнным апекуном эпохі Асветніцтва. А канфуцыянства было абвешчана, у адрозненне ад хрысціянства, верай розуму, свабоднай ад усялякіх забабон і недарэчных легенд. На яго аснове больш за два тысячагоддзі назад была створана ўнікальная дзяржаўная машына, якая кіравала вялікай дзяржавай, большай, чым Рымская імперыя, і аказалася адной з самых жыццяздольных палітычных сістэм, калі-небудзь створаных чалавекам. На думку Вальтэра, кітайскі палітычны рэжым з’яўляецца дэспатызмам толькі па форме. На самай справе гэта асветніцкая манархія з імператарам-філосафам на троне. Таму, пісаў Гальбах, каб знайсці народ шчаслівы, дзякуючы ўстановам, у якіх палітыка цесна звязана з мараллю, дзе народ, дзяржаўны лад цалкам адпавядаюць ідэалу і заслугоўваюць пераймання еўрапейскіх урадаў, трэба накіравацца ў Кітай.

Гэта ўжо потым усякія сур’ёзныя стасункі Кітая з Захадам сталі нагадваць хутчэй вуліцу з аднабаковым рухам. Прысвоіўшы выключна сабе права называцца ўніверсальнай цывілізацыяй, канцэпцыю прагрэсу, развіцця і капіталізму, еўрапейцы таксама старанна заняліся распрацоўкай і распаўсюджваннем міфа пра інертны, закасцянелы і дэспатычны Усход.

***— І былі нават тэорыі, якія сёння не заўсёды сур’ёзна ўспрымаюцца…***

— Як, да прыкладу, і гэтае перакананне. Перавагу еўрапейцаў над кітайцамі Мантэск’ё тлумачыў, дарэчы, бадзёрым кліматам Еўропы. Паколькі “распешчанасць людзей у спякотным клімаце заўсёды рабіла іх рабамі”. Да гэтага хору “добразычліўцаў” неадкладна падключыліся К. Ліней, Д. Юм, І. Кант ды іншыя прызнаныя навуковыя аўтарытэты, якія пераконвалі сваіх чытачоў, што кітайцы, аказваецца, наогул іншы від людзей, “жоўтыя азіяты”. Іх называлі нашчадкамі выраадкаў ад скрыжавання індзейцаў і манголаў. У адрозненне ад белай расы яны, маўляў, наогул не здольныя да сапраўднай цывілізацыі і гістарычнай творчасці. Так, не паспеўшы нарадзіцца ў розумах асветнікаў, еўрапейская цывілізацыя стала жыць па ўласных паняццях, прэтэндаваць на сваю выключную місію.

***— Ох ужо гэтыя памкненні да “выключнасці”…***



— Энергія думкі падсілкоўвала энергію дзеяння. Яна пераўтварыла памкненне да поспеху ў базавую ўласцівасць чалавечай асобы і еўрапейскага грамадства ў цэлым. Абвясціла надоўга экспансію і каланіялізм у асноўны прынцып і метад цывілізацыйнага лідарства. Параўнальная сусветная гісторыя, непасрэдны кантакт старажытнай кітайскай і маладой еўрапейскай цывілізацый скончыліся "трыумфам сучаснасці" ў Еўропе і Амерыцы і "эпохай уніжэння" ў Кітаі. Гэтыя дзве крайнасці цывілізацыйнага развіцця пакідаюць адкрытым пытанне аб тым, што чакае свет ва ўмовах, калі асноўныя гульцы памяняюцца месцамі. Калі Захад па-ранейшаму лічыць правільным паводзіць сябе з ужо Новым Кітаем як з дрэнным вучнем, "жоўтай пагрозай", а не партнёрам.

***— Яшчэ з пачаткам перабудовы ў Савецкім Саюзе і потым ужо ў суверэннай Беларусі многія палітолагі, ды і палітыкі-практыкі, азіраліся і нават сёння азіраюцца ў выбары мадэлі ўладкавання новага жыцця выключна на Захад, Амерыку... Вы не аднойчы ў сваёй працы гаворыце пра тое, што сам Захад выказаў жаданне вучыцца ва Усходу... У чым жа гэта выяўляецца? Якія мадэлі дзяржаўнага ўладкавання бярэ на ўзбраенне Захад з досведу Кітая ці іншых краін Паўднёва-Усходняй Азіі?***

— Гісторыю заўсёды пісалі пераможцы. Аднак заходняя цывілізацыя ў сваім гарачым жаданні быць усеагульнай нормай для чалавецтва проста пераацаніла свае сілы і магчымасці. Аднолькава сумна канулі ў лету гутаркі аб "місіі белага чалавека", развіцці рыначнай эканомікі і дэмакратыі, перавагах глабалізацыі для народаў усіх краін. "Шукайце ісціну ў фактах", — раяць кітайцы. Ідэя "канца гісторыі", яе завяршэння ў касмапалітычнай эпосе свабоднай рыначнай эканомікі і ліберальнай дэмакратыі скончылася для Захаду і ЗША вялікім канфузам.

***— Выходзіць, што многія тэорыі проста праваліліся?***

— Я сказаў бы крыху інакш. Гэта нават не правал, а больш сістэмны крызіс палітыкі ваяўнічага заходняга індывідуалізму і настойлівага праследавання ўласных інтарэсаў. Заслужаная расплата за пастаянную экспансію, рабства, каланіялізм, разрабаванне, аднятую гісторыю і будучыню ў мільярдаў людзей. Многія з іх даўно ўсумніліся ў прыродзе і перавагах сучаснага капіталізму, вартасцях заходняй палітычнай сістэмы.

Больш за тое, многія ўважлівыя аналітыкі даўно звярнулі ўвагу, што заходняя цывілізацыя сама страціла веру ў прагрэс. З гэтым звязаны пастаянныя прароцтвы аб крушэнні Захаду. Ужо для О. Шпенглера ў "Сконе Еўропы" гісторыя ператвараецца ў працэс "з узвышанай бязмэтнасцю", калі цывілізацыі "з'яўляюцца, выспяваюць, вянуць і ніколі не паўтараюцца". Стомленасць ад уласнай гісторыі — гэта сур'ёзная хвароба, панове. Яна вельмі небяспечная ў сваім імкненні ператварыць уласнае пахаванне ў паніхіду па ўсёй чалавечай цывілізацыі. Таму будучыню штурмуюць "пераможаныя". У кітайцаў ёсць для гэтага відавочныя перавагі. Яны даўно навучыліся не звяртаць увагу на ўсе агучаныя глупствы пра ўласную краіну і перспектывы сусветнага развіцця. Захад прапаноўвае шукаць "новую Айчыну" ў "змене арыенціраў". А мадэрнізацыя ў Кітаі разглядаецца як "вяртанне да сябе". Таму "няхай мёртвыя самі хаваюць сваіх мерцвякоў", а не блытаюцца пад нагамі ў жывых, поўных сіл і амбіцый. Новы Кітай з самага пачатку не меў намеру паўтараць досвед Захаду і прытрымлівацца яго парадаў.

Поспехі мадэрнізацыі Кітая ды іншых краін Паўднёва-Усходняй Азіі

можна растлумачыць толькі гэтай акалічнасцю. Пачынаючы ўздым да вышынь росту і развіцця, “азіяцкія тыгры” стварылі на базе традыцыйных канфуцыянскіх каштоўнасцяў тып “разумнай дзяржавы”. Яе стрыжнем з’яўляецца своеасаблівы грамадскі дагавор паміж урадам і кіруемым насельніцтвам адносна мэт развіцця, пераадолення эканамічнай адсталасці, беднасці і няроўнасці. Гэта забяспечыла актыўную падтрымку рэформ, сацыяльны мір і палітычную стабільнасць. Значэнне гэтых фактараў для паспяховага развіцця лепш за ўсё разумеюць тыя ўрады, дзе гэтыя ўмовы адсутнічаюць. Незадаволенасць і абурэнне грамадзян няздольнасцю сваіх кіраўнікоў забяспечваць эканамічны рост і паляпшаць сітуацыю з роўнасцю знішчала многія палітычныя рэжымы і пахавала самыя амбіцыйныя планы рэформ. Гэта стала прычынай шматлікіх крызісаў лідарства, імпічментаў, канстытуцыйных і ваенных пераваротаў, з’яўлення значнай колькасці дзяржаў, якія не адбыліся.

***— Асобны раздзел кнігі “Кітай. Крылы Дракона” — “Вораг дзяржавы N 1” — пра карупцыю. Які ж нацыянальны каларыт гэтай з’явы ў Кітаі?***

— Паўтарыць у Кітаі станоўчы прыклад Сінгапура па барацьбе з карупцыяй пакуль не атрымліваецца па многіх абставінах. Карупцыя мае свой асаблівы нацыянальны каларыт і больш глыбокія карані, звязаныя з традыцыямі сваяцтва ў традыцыйным кітайскім грамадстве. Аднак партыйнае кіраўніцтва цалкам падзяляе ідэю “чыстага ўрада” і неабходнасць жорсткіх мер па барацьбе з гэтым злом. Старшыня Сі Цзіньпін прызнае, што, калі не стрымаць рост карупцыі, гэта “непазбежна прывядзе партыю і нацыю да гібелі”.

***— Падобная шчырасць лідара дзяржавы супярэчыць прынцыпу “выстаўляць напаказ толькі поспехі”...***

— Аднак з улікам асаблівасцяў сваёй палітычнай сістэмы кітайскае кіраўніцтва з’яўляецца самым строгім крытыкам




уласнай дзейнасці. Яны ўпэўнены, што, ведаючы слабасці, лягчэй зразумець сваю сілу. У краіне аб’яўлена пастаянная кампанія барацьбы з “чатырма пошасцямі”: фармалізмам, бюракратызмам, эпікурэйствам і імкненнем да раскошы. Ажыццёўлены маштабныя “зачысткі” цэлых галін і сфер партыйнай і дзяржаўнай дзейнасці. У адпаведнасці з прынцыпам “нулявой цярпімасці” і вяртання высокага “асабістага вымярэння ўлады”, прыцягнуты да адказнасці сотні тысяч членаў партыі. Мэта гэтага “вялікага паходу” сфармулявана цалкам у духу часу: каб усе чыноўнікі “баяліся — не маглі — не хацелі” злоўжываць службовым становішчам і браць хабар.

***— “Культурная рэвалюцыя” ў Кітаі шмат у чым адзначана тым, што фактычна знішчыла інстытут дзяржаўнай службы. У канцы 1980-х гг. у Паднябеснай была аб’яўлена рэформа дзяржаўнай службы. Праходзіла яна паэтапна, эвалюцыйна. Ці працягвае сёння ў Кітаі дзяржава ўносіць якія-небудзь змены ў фармат дзяржаўнай службы?***

— Аднаўленне дзяржаўнай службы пачалося ў Новым Кітаі з вяртання да практыкі конкурсных іспытаў для займання дзяржаўных пасад і стварэння лепшай у свеце сістэмы па падборы кадраў. Асновы гэтай сістэмы ўзніклі больш за дзве тысячы гадоў назад у імператарскім Кітаі і цалкам сябе апраўдалі на ўсіх этапах супярэчлівай гісторыі краіны. Падчас працяглай адміністрацыйнай рэформы дзяржслужба набыла цалкам сучасны выгляд і шмат у чым нагадвае падобныя інстытуты ў іншых краінах. Асноўнымі прынцыпамі паступлення на службу вызначаны адкрытасць, даступнасць і справядлівасць. Дарэчы, з 1 студзеня 2016 года ўступіў у сілу новы тэкст прысягі дзяржаўных чыноўнікаў. Яны клянуцца быць вернымі і годна абараняць Канстытуцыю, выконваць законы і абавязкі, быць адданымі Радзіме і лаяльнымі да народа, прысвяціць сябе сваім абавязкам усёй душой. Абавязуюцца падтрымліваць цэласнасць дзяржавы, прыняўшы ў рукі кіраванне людзьмі, аддана працаваць, каб будаваць квітнеючую, дэмакратычную, цывілізаваную і гарманічную сацыялістычную краіну.

Менавіта ў гэтым заключаюцца прынцыповыя асаблівасці прававога становішча кітайскіх дзяржслужачых. Галоўнай умовай для паступлення на дзяржаўную службу называецца “валоданне здавальняючымі маральнымі якасцямі”. У пералік абавязкаў чыноўніка ўключана патрабаванне “ўсёй душой і ўсімі намерамі служыць народу і быць пад яго пастаянным кантролем”, “быць прыкладам прытрымлівання грамадскіх маральных нормаў”. Ацэнка маральных якасцяў і сумленнасці чыноўнікаў з улікам калектыўных меркаванняў і ацэнак з’яўляецца складовай часткай іх рэгулярнай атэстацыі.

Гутарыў Алесь **Карлюкевіч**



## Абгрунтаванае права ўзысці на п'едэстал

**Беларускія студэнты — сярод лепшых на міжнародным конкурсе ў Вашынгтоне**

На "алімпійскіх гульнях" для будучых юрыстаў (менавіта так часта называюць гэтае прэстыжнае спаборніцтва), якія праводзяцца з 1957 года, каманда факультэта міжнародных адносін БДУ перамагла ў намінацыі "Паказальныя выступленні".

Сёлета ў спаборніцтве ўдзельнічалі студэнты больш як з 90 краін, конкурсныя заданні па традыцыі ўяўлялі з сябе гульнявую мадэль Міжнароднага суда ААН. А тэмай для імправізаванага судовага разгляду стала справядлівае выкарыстанне водных рэсурсаў, права на ваду і адказнасць за яго парушэнне. Гаварылі выступоўцы і пра абарону культурных каштоўнасцяў. БДУ прадстаўлялі трэцякурсніца Ліліт Ерыціян і студэнткі чацвёртага курса Маргарыта Змачынская, Лізавета Чаканава і Дар'я Богдан. У сваёй пераможнай намінацыі каманда абышла канкурэнтаў з 17 краін, у тым ліку з Сарбоны, універсітэта Вероны, Кіеўскага ўніверсітэта імя Т. Шаўчэнкі. Дарэчы, Даша Богдан святкавала яшчэ і індывідуальную перамогу: яе прызналі лепшым прамоўцам у намінацыі "Паказальныя выступленні". Трэніравала дзяўчынак дасведчаная ў такіх спаборніцтвах Алена Коннава, старшы выкладчык кафедры міжнароднага права БДУ.

Летась каманда факультэта міжнародных адносін БДУ таксама падымалася на п'едэстал. Тады каманда ў складзе Таццяны Зіняковай, Лізаветы Тарасевіч, Лізаветы Трахалінавай, Кацярыны Шкарбуты і Алены Хадарцэвіч стала другой у намінацыі "Пісьмовы выклад прававой аргументацыі". Студэнткі на англійскай мове распрацавалі тактычныя метады абароны і абвінавачвання на тэму злачыннасці ў кіберпрасторы.






## На шляху з "варагаў у грэкі"

**Археолагі знайшлі ўнікальнае гарадзішча вікінгаў у Віцебскай вобласці**

Аказваецца, важны пункт на шляху "з варагаў у грэкі" знаходзіўся на беразе Заходняй Дзвіны паміж Віцебскам і Полацкам. Паселішча спецыялісты назвалі Кардонам — у гонар бліжэйшай вёскі, а Нацыянальная акадэмія навук унесла адкрыццё ў топ-10 падзей за 2016 год.

— На сляды паселішча мы выйшлі пасля маніторынгу сайтаў "чорных капальнікаў", — расказала нашаму карэспандэнту загадчыца археалагічнага цэнтра Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Вольга Ляўко. — Гарадзішча ўнікальнае тым, што ў чыстым выглядзе адлюстроўвае IX-X стагоддзі — слаба ўлоўны перыяд для археолагаў. Часта мы маем справу са шматслойнымі помнікамі, дзе гэтая эпоха змешваецца з іншымі. Але самае галоўнае, што цяпер можна сказаць упэўнена: аснова шляху "з варагаў у грэкі" была закладзена менавіта на тэрыторыі беларускага Падзвіння.

## Вялікі палачанін пакарае свет

**Францыск Скарына — постаць сусветнага маштабу. Таму і святкаванне 500-годдзя беларускага кнігадрукавання праходзіць з сусветным размахам**

На VIII Варшаўскім кніжным кірмашы, які прайшоў 18-21 мая, нацыянальны стэнд "Кнігі Рэспублікі Беларусь" быў прысвечаны 500-годдзю беларускага кнігадрукавання. На Румянцаўскіх чытаннях, якія адбыліся ў Расійскай дзяржаўнай бібліятэцы, таксама гаварылі пра вялікага палачаніна і выдадзеную ім першую ўсходнеславянскую друкаваную Біблію. Прэзентацыі факсімільнага выдання Скарыны шырока адзначаліся ў Латвійскай нацыянальнай бібліятэцы і Нацыянальнай бібліятэцы Эстоніі. У Нацыянальнай бібліятэцы Літвы імя М. Мажвідаса адбыўся "круглы стол": "Францыск Скарына. 500-годдзе кнігадрукавання ў Беларусі і Літве". Не застаўся ўбаку і Лондан, дзе ёсць бібліятэка, якая носіць імя Скарыны. У Бялградзе запланавана навукова-практычная канферэнцыя, ва Вроцлаве — спецыяльная сесія падчас Сусветнага бібліятэчнага і інфармацыйнага кангрэса ІФЛА. "Малая падарожная кніжка" Францыска Скарыны, выдадзеная ў 1522 г. у Вільні, адправілася ў падарожжа па краінах, дзе пабываў першадрукар, — Літву, Польшчу, Чэхію, Італію. І гэта далёка не ўся геаграфія сучаснай скарыніяны.

# Святая прастата, схаваная ў іконе



СЯРГЕЙ ЛАЗЮК

**Калі ўзляцець над зямлёю, узняцца высока за аблокі і кінуць позірк на зямлю, то Палессе будзе выглядаць цёмна-зялёнай выцягнутай плямай на тэрыторыі чатырох дзяржаў: Беларусі, Украіны, Польшчы і Расіі. Цёмнай яна будзе з-за лясоў і балот. За апошняе стагоддзе і лясы парадзелі, дый балотаў стала ў некалькі разоў менш. Агульная плошча Палесся складае каля 130 тысяч квадратных кіламетраў. Але давайце спусцімся на цудоўную грэшную зямлю, зазірнем у жыллё палешука. І сёння, хоць усё моцна памянялася, у многіх хатах на покуці будуць вісець абразы. У кагосьці старыя, якія дасталіся ад прадзедаў, у кагосьці навейшыя. Гэтыя абразы не вельмі падобныя да тых, што вісяць у сталічных храмах, але людзі іх шануюць і любяць. Не так даўно ва Украіне выйшла кніга, прысвечаная абразам. Туды ўвайшлі іконы і з Гомельскага Палесся. Нядзіўна, бо некалі даўно ўсе гэтыя землі ўваходзілі ў адну вялікую дзяржаву — ВКЛ (Вялікае Княства Літоўскае).**

Я сяджу ў майстэрні калекцыянера і мастака Ігара Сурмачэўскага. На маніторы яго камп'ютара адна карцінка змяняе другую, узнікаюць і знікаюць лікі святых. Багародзіца, Спас, Уваскрашэнне, Ушэсце... А на сценах арыгіналы — вялікія і маленькія абразы, такія ж, як віселі ў хатах палешукоў. Праўда, у майстэрні яны без ручнікоў і апраў — раздзетыя, але назваць іх дошкамі язык не паварочваецца.

"На самай справе гэта цэлы пласт мастацтва, які належыць тром, а можна сказаць, і чатыром народам. Калі я ўбачыў іх першы раз, а гэта было не ў музейных залах і сховішчах, то адчуў і зразумеў, што гэта зусім незвычайнае мастацтва. Такое ж, як карціны грузіна Ніко Пірасманішвілі, француза Анры Русо і югаслава Івана Генераліча. Мне падаецца, што само Палессе дапускала такое своеасаблівае прачытанне Бібліі", — разважае Сурмачэўскі.

***— Паслухай, Ігар, некалі даўно мне распавядаў пра абразы веткаўскіх стараавераў Фёдар Шкляраў. Ён гаварыў, што абраз пісаўся для таго, каб праілюстраваць Біблію. Бо большасць нашых далёкіх продкаў чытаць не ўмелі. Ікона для вернікаў замяняла кнігу, тэлевізар, кіно... І мастаку трэба было адлюстраваць біблейскі сюжэт так, каб непісьменны земляроб, рыбак, рамеснік мог усё ўбачыць, зразумець, прачытаць.***

— Так, менавіта так! Адкуль і дзе мясцовы багамаз мог убачыць сапраўдны Іардан, Галгофу, Іерусалім? Таму апостал Андрэй мог быць адлюстраваны з вудай або таптухай на беразе Прыпяці. Тут з'яўляецца Хрыстос, падобны да жыхара суседняй вёскі, і гаворыць Андрэю, каб той ішоў за ім. Аналагічная гісторыя і са святым Георгіем, які забівае кап'ём змея. Часцей за ўсё страшны змей нагадваў



казачнага цмока. Такі мог жыць у суседнім непраходным балоце. Амаль усе палескія абразы, за рэдкім выключэннем, вельмі добра кладуцца на народны каляндар і казкі. І ўсе цудоўныя кветкі, якіх так шмат на народных абразах, сімвалізуюць Рай, а чорны фон — не змрок і жах, а бясконцасць, Сусвет.

***— Раскажы падрабязней пра сюжэты.***

— Святочных у палескай іконе амаль няма. Людзі хацелі мець дома абаронцаў усяго таго свету, у якім яны жылі ды існавалі. Гэта і гаспадарка: коні, дзеці, жонка... Гэта і сялянская праца. А ведаеш, чаму на Палессі такая папулярная і шануемая ікона з выявай Божай Маці Трохручыцы? Толькі не смейся. Палешукі верылі, што менавіта гэты абраз дапамагае што-небудзь беспакарана ўкрасці. Мне патэлефанавалі і паведамілі, што знайшлі ікону з надпісам “Беларуская Багародзіца”. Заінтрыгавалі, прывезлі Трохручыцу. Я пачаў разбірацца, вывучаць амаль абсыпаны надпіс. Высветліў, што напісана яна ў манастыры на Браншчыне, які стаяў у Белым Беразе, а ікона называецца Белабярэжская.

***— Майму дзеду яго бацька падарыў на вяселле ікону Пачаеўскай Божай Маці. Што яна сімвалізавала?***

— Несла мір мужу і жонцы, абараняла сямейны ачаг. А напісана яна, магчыма, і ў самой Пачаеўскай лаўры, на тэрыторыі Украіны. Хутчэй за ўсё, нехта з тваіх продкаў хадзіў туды ў паломніцтва і прынёс абраз у вёску на Гомельшчыну. Такой жа папулярнай была і Ахтырская Багародзіца. З ёю звязаны дзіўны народны рытуал. Зразумела, што за год у хаце іконы цямнелі, на іх асядала сажа лампадак і свечак. Перад святам іх беражліва мылі. Дык вось вада, якой абмывалі, лічылася гаючай, якая дапамагае пры ліхаманцы, што лютавала адзін час на Палессі. А ікона святой Варвары засцерагала ад нечаканай смерці. Зноў жа звязана з вадой і балотам. Варвара абараняла дзяцей, берагла іх і не давала патануць. Кожная маці хацела такую мець у хаце. Вось святая Параскева лічылася жаночай іконай, якая дапамагае па гаспадарцы. Гэтую святую ў народным календары ўяўлялі беднай старой, якая ходзіць і глядзіць, каб гаспадыня ў святы не працавала.



Убачыць такую працаўніцу, пераблытае ёй усё прадзіва так, што жанчына і за год разабраць не зможа...

***— А якія святыя засцерагалі гаспадара?***

— Святы Георгій, Фрол і Лаўр... І, вядома ж, Мікола Угоднік. Ён апякун беднякоў. Нават сёння гавораць, што калі табе ўжо ніхто не можа дапамагчы, то прасі дапамогі і абароны ў святога Міколы. Усё жыццё нашых продкаў было звязана з іканастасам.

***— Калі з’явіліся першыя палескія абразы?***

— Пачатак XVIII стагоддзя, а росквіт — сярэдзіна XIX. Іх называюць па-рознаму: народныя, уніяцкія, мужыцкія, сялянскія. Гэта не высокае прафесійнае мастацтва, але вельмі своеасаблівае і незвычайнае. Раней да яго ставіліся пагардліва і даволі скептычна. Гэтак жа, як і да карцін Пірасмані. Але прайшоў час, і ўсё ўстала на свае месцы. Многія калекцыянеры зразумелі іх каштоўнасць і актыўна збіраюць. У некаторых з іх, калі быць уважлівым, можна ўбачыць водгалас карцін вялікіх мастакоў Адраджэння: Рафаэля, Тыцыяна, Джота... Карціны хадзілі ў выглядзе гравюр на паперы, а мясцовыя мастакі іх перамалёўвалі, падганяючы пад жаданні заказчыкаў і сваё разуменне святасці ды прыгажосці.

***— Сюжэтаў шмат, але ў хаце звычайна тры-чатыры абразы.***

— Не. Калі паглядзець старыя фатаграфіі пачатку мінулага стагоддзя, то абразоў у хатах палешукоў шмат. Часам яны вісяць ад покуці суцэльным дыванам, у два-тры рады. Сённяшняга мінімалізму не існавала. Лічылася, чым больш, тым лепш.

Многія прафесіяналы ставяцца да інсітнага мастацтва з пагардлівасцю, як да чагосьці не годнага ўвагі. Маўляў, пісалі гэтыя абразы самавучкі, якія не атрымалі прафесійнай адукацыі. А як жа тады быць з народнымі песнямі, казкамі? Бо і іх стваральнікі літаратурных інстытутаў з кансерваторыямі не заканчвалі. Ды і шмат чаго можна ўспомніць: пабудаванага, напісанага, намаляванага людзьмі, якія не атрымалі прафесійнай адукацыі. Іх карціны, песні, посуд грэюць і радуюць нас дагэтуль, бо ў іх укладзены талент, любоў і вера.

Уладзімір **Сцяпан**



# На крылах кахання


Яна Штангей (Ора) і Такатошы Мачыяма (Ор)

МАРАТ ШАХМАЦЬЕЎ

## Уражанні пра сусветную прэм'еру балета "Ор і Ора", якой Вялікі тэатр Беларусі завяршыў 84-ы тэатральны сезон

Ужо і не ведаю, да якіх яшчэ цудоўных эпітэтаў звярнуцца, каб выказаць сваё захапленне адным з самых любімых і шануемых тэатраў краіны, дзе, усякі раз знаходзячыся, зведваю радасць ад судакранання з высокім мастацтвам, ці тое опера, ці балет. У чарговы раз Вялікі ўразіў і мае ўяўленне новым спектаклем, які абавязкова пагляджу яшчэ раз у іншым складзе выканаўцаў, калі тэатр у верасні адкрые свой 85-ы юбілейны сезон.

Гэта быў дзень, дакладней ноч, калі мы з мужам, быўшы ў водпуску, ляцелі транзітам з індыйскага Кочына, што ў штаце Керала, праз Абу-Дабі, дзе, прызямліўшыся, чакалі ранішняга рэйса на Мінск. У чарзе маіх прыемных разваг аб вяртанні дадому мільгацелі здрадніцкія думкі:

на прэм'еру ў Вялікі сёння ні за што не пайду, толькі б паспаць… Памятаю, нават агучыла іх, на што муж не зрэагаваў. Відаць, не паверыў, ведаючы маю любоў да гэтага тэатра. А спаць сапраўды хацелася: адбівалася розніца ў часе паміж экватарам і нашай сярэдняй еўрапейскай паласой.

Але шчаслівае прызямленне ў мінскім аэрапорце, святочны абед з дзецьмі, якія яго арганізавалі, нашы гасцінцы з духмянымі манга, свежым лісцем кары і экзатычным салодкім фруктам мангус, што яшчэ суткі назад ляжалі ў скрынях у індуса-латочніка, абудзілі адрэналін. І натхнілі не здраджваць прынятаму напярэдадні водпуску рашэнню: пайсці на балет у дзень вяртання з адпачынку, як бы ні стаміліся. І на гэтай хвалі адданасці і

Што ж, у такіх выпадках кажуць: нешта ў гэтым ёсць. Паколькі ні ўрачыстая атмасфера фае, ні зіготкія люстры Вялікага, якія ўсякі раз мяне заварожваюць, не вырвалі з індыйскага чароўнага "воблака". Адтуль я і павіталася з Уладзімірам Грыдзюшкам, дырэктарам тэатра. Ён быў святочна натхнёны і, як звычайна, апрануты ў прэм'ерны смокінг з абавязковымі атрыбутамі — белай кашуляй і чорнай бабачкай. Было відаць, як прыемна яму падзяліцца радасцю: маўляў, першая прэм'ера прайшла бліскуча… Дарэчы, сусветнай яе называюць таму, што пастаўлена яна ўпершыню ў Мінску.

Яшчэ да пачатку спектакля мы паспелі пагартаць сёмы нумар часопіса "Партэр" і пазнаёміцца з перадгісторыяй стварэння балета "Ор

саміх сябе, спрыяюць раскрыццю творчых здольнасцяў, арыгінальнаму асэнсаванню быцця, сцвярджэнне вядомае. Падарожнічаюць героі Джэка Лондана, Аляксандра Грына, Антуана дэ Сент-Экзюперы ды многіх іншых пісьменнікаў і паэтаў. Бо свет, як выказаўся Святы Аўгусцін, гэта кніга, і тыя, хто не падарожнічаюць, чытаюць толькі адну яе старонку. З гэтым цяжка паспрачацца. Вандруючы, мы пашыраем свядомасць, становімся духоўна багацейшымі. Схільнасць да творчага асэнсавання ўбачанага, знаёмства з іншымі народамі дае жыццё новым творам у літаратуры, мастацтве, публіцыстыцы. Вось так і я, пабываўшы ў Індыі мінулым летам, дзялілася сваімі ўражаннямі з чытачамі часопіса ў нарысавых нататках



МІХАІЛ НЕСЦЕРАЎ

Салісты Людміла Хітрова і Алег Яромкін (у цэнтры) і артысты балета Вялікага тэатра Беларусі

адрэналіну туды і накіраваліся. Яшчэ не было адчування, што мы дома, у Мінску: Індыя з яе чароўнымі спецыфічнымі водарамі не адпускала. Падавалася, мы ўсё яшчэ ў яе абдымках. Спеў птушак, усмешлівыя твары індыйцаў, пахі архідэй і магнолій, курыльных духмяных рэчываў і спецый, шум акіяна… Усё гэта рэальна засталося ў Індыі, але адначасова знаходзілася з намі. Мы як бы не выпалі канчаткова са свету, дзе пабывалі. Дарэчы, псіхолагі тлумачаць гэты феномен банальнай акліматызацыяй, калі чалавек, не адпачыўшы, яшчэ не можа адарвацца ад месцаў, дзе знаходзіўся. Мае месца быць, як гаворыцца, псіхасаматыка. А экстрасэнсы наогул гавораць пра энергетыку, якая трымае чалавека.

і Ора". І што прыемна, аўтар лібрэта Вячаслаў Заранкоў, мастак, пісьменнік, навуковец-вынаходца і бізнесмен, — ураджэнец Беларусі з Аршанскага раёна. Там ён жыў да 17 гадоў, а потым пераехаў у Санкт-Пецярбург, у той час — Ленінград. І, як расказала нам Алена Балабановіч, вядучы рэдактар аддзела маркетынгу, інфармацыі ды рэкламы Вялікага тэатра, уся яго творчасць і мецэнацкая дзейнасць працята ідэяй тварэння. Ён дапамагае таленавітым мастакам, пісьменнікам, артыстам, піша карціны і апавяданні, шмат падарожнічае. Дарэчы, сюжэт лібрэта да балета "Ор і Ора", як і сюжэты іншых твораў Заранкова, заснаваны на рэальных падзеях.

Зрэшты, пра тое, што падарожжы адкрываюць новы погляд на свет, на

(№12-2016). Спадзяюся на іх працяг. Але вернемся ў Вялікі.

Аказалася, гісторыю "Арлы і людзі", у якую, па словах Балабановіч, цяжка паверыць, Вячаслаў Заранкоў расказаў на сустрэчы з журналістамі. Ён назіраў яе на Кіпры. Слухаючы Алену, я адчувала, як павольна раставаецца, адпускае мяне індыйскае "воблака": настолькі неверагодным падалося мне ўсё тое, што адбылося з Заранковым. Стомленасці як і не бывала. І я ціха радавалася, што мы ў зале, дзе ўжо ў аркестравай яме артысты аркестра настройвалі інструменты.

А гісторыя з птушкамі такая.

Аднойчы позным вечарам вялікі арол прыляцеў на балкон Заранкова і стаў біцца ў шкло. Вячаславу ўдалося злавіць птушку і супакоіць. А раніцай



ПАВЕЛ БАС

ён выпусціў яе на волю. Але арол, замест таго, каб паляцець, зрабіў круг і рынуўся на балкон суседняй кватэры, разбіў шкло і праз нейкі час з'явіўся ўжо з арліцай. І гэтая дзіўная пара паляцела. Заранкоў жа не мог дачакацца моманту знаёмства з суседзямі: такой займальнай падалася яму гэтая гісторыя з птушкамі. Але яна аказалася больш чым цікавай. Апынулася, што арол ды арліца спрыялі ўз'яднанню пары яго суседзяў па балконах. Вось яго перадгісторыя. Сябры ў свой час падарылі закаханым арла. А той знайшоў сабе спадарожніцу, якую маладыя людзі таксама прынялі. Праз некаторы час яны расталіся, раз'ехаліся ў розныя гарады, кожны ўзяў сабе па птушцы. Але арол не вынес адзіноты, паляцеў ад гаспадара і адправіўся на пошукі сяброўкі. І знайшоў яе, паказаўшы людзям, што такое сапраўдная вернасць. Дзякуючы птушкам, закаханыя ізноў апынуліся разам.

У выніку ў Заранкова і нарадзілася ідэя лібрэта. У яго аснове, па прызнанні аўтара, ляжыць ідэя кахання і шчасця, якога вартыя ўсе на зямлі: і птушкі, і людзі.

Што ёсць каханне паміж мужчынам і жанчынай, любоў паміж чалавекам і светам? Наколькі ўзвышаным гэтае пачуццё можа быць? І што перашкаджае каханню паміж людзьмі выжыць у соцыуме, з якім мы ўсе суіснуем? І што такое любоў да чалавецтва і вера ў нябеснае жыццё пасля смерці? Пра гэта і пра іншыя вечныя тэмы балет "Ор і Ора".

Харэографам, балетмайстрам-пастаноўшчыкам і суаўтарам лібрэта Аляксандрай Ціхміравай, артыстамі балета — а іх па некалькі чалавек на партыю — гэтыя ідэі ўвасоблены бліскуча. Да прыкладу, Ору танцуе дзевяць выканаўц, а Ора — шасцёра артыстаў балета. Другую прэм'еру саліравалі Вікторыя Трэнкіна і Мікіта Шуба. А партыю Мужчыны танцаваў Алег Яромкін, заслужаны артыст Беларусі, Жанчыну — Людміла Хітрова, лаўрэат міжнароднага конкурсу, уладальнік медаля Францыска Скарыны.



ПАВЕЛ БАС

Людміла Хітрова (Жанчына)

Усё ў спектаклі цэласнае, стройнае, адпавядае. Балет творчай пастановачнай садружнасці беларусаў і расіян-піцерцаў атрымаўся асэнсаваны, змястоўны, насычаны яркімі вобразамі ў абрамленні сцэнаграфіі Вячаслава Окунева, народнага мастака Расіі. Яна складаецца з двух ярусаў. Унізе — наш зямны свет, другі "паверх" — свет нябесны, анёльскі, боскі. І як ён нараджаецца ў нашых душах дзякуючы каханню — і гэтая тэма, як і тэма прабачэння, гучыць у спектаклі выразна. Паводле слоў Аляксандры Ціхміравай, кожны чалавек нясе ў сабе боскую іскру. Усё наша жыццё — гэта спроба хоць крыху наблізіцца да дасканаласці. А прабачаючы адзін аднаму, мы становімся больш чыстымі, лепшымі. Птушкі Ор і Ора ў спектаклі прадстаўляюць усё, што звязана з духоўнасцю, таму яны побач з людзьмі. Гэта як бы і вышэйшая, боская іпастась Мужчыны і Жанчыны, якія з'яўляюцца звычайнымі людзьмі, здольнымі памыляцца ў выніку сваёй зямной мяцежнай прыроды.

Сольныя партыі чатырох галоўных герояў то плаўна, то імкліва ўпісваюцца ў масавыя танцы і таксама плаўна ці імкліва выходзяць на першы план. Цудоўная і музыка кампазітара расіяніна Міхаіла Крылова з яе меладычнасцю, і сучасная аранжыроўка



Фінальная сцэна спектакля

беларуса Алега Хадоскі, якая падкрэслівае вастрыню балетнай формы.

Як гаворыць Аляксандра Ціхамірава, тэма палёту вельмі блізкая творчасці. І мы ведаем: яна неаднаразова звярталася да яе ў іншых спектаклях, спрабуючы адказаць на пытанне, што азначае для мастака магчымасць лятаць, тварыць. У працяг гэтай тэмы і ўзнікла гісторыя пра людзей і птушак, творча асэнсаваная Вячаславам Заранковым.

Спектакль пачынаецца світаннем. На сцэне — шэры свет, ён у спячцы, яшчэ не нарадзіўся ў ім чалавек. Людзі ў коканах. Сюды прылятаюць дзве белыя птушкі і сярод коканаў выбіраюць Мужчыну і Жанчыну, удыхаюць у іх жыццё і каханне, а з імі і святло, і надзею. Свет становіцца каляровым, надыходзіць вясна... І каханне Мужчыны і Жанчыны расцвітае. Іх пачуцці ўвенчваюцца вяселлем. Але побыт ёсць побыт, ён зацягвае, пачынаюцца непаразуменні, якія заканчваюцца сваркамі, што азмрочваюць жыццё. Ён і яна разгубленыя: зусім нядаўна яны былі шчаслівыя, Алега Яромкіна і Людмілу Хітрову быццам пакідае жыццё. Рукі выканаўцаў падаюць як плеці, героі то застываюць у здзіўленні, то мітусяцца па сцэне...

Святло, мір і радасць вяртаюць птушкі. Яны з’яўляюцца побач і нібы заклікаюць людзей успомніць пра сябе ранейшых. У рухах Вікторыі Трэнкінай і Мікіты Шубы — анёльская любоў і спачуванне да Мужчыны і Жанчыны. Алег Яромкін і Людміла Хітрова даносяць ідэю аўтараў лібрэта пра абуджэнне вышэйшай прыроды ў чалавеку. Толькі зварот да яе здольны змяніць чалавека і дапамагчы яму ў зносінах адно з адным. Свет зноў становіцца каляровым.



ПАВЕЛ БАС

Алег Яромкін (Мужчына)

Але зайздрасць да чужога шчасця не дае спакою шэрай масе людзей, пазбаўленых кахання. Шэрая маса наступае, імкнучыся раз’яднаць закаханых... Знішчаецца шлюбнае ложа, ірвецца каляровае шлюбнае пакрывала... І Мужчына, і Жанчына зноў перастаюць разумець адно аднаго. Злоўлена і Ора... Так тэатр узмацняе акцэнт: без духоўнага складніка мы мёртвыя.

Будзе яшчэ ў спектаклі і трэці, магутны акцэнт: чалавек шчаслівы толькі тады, калі ў ім гарманічна суіснуюць дзве яго прыроды: зямная і боская. Гэтае шчасце адлюстравана ў выдатным танцавальным квартэце людзей і птушак. Танец Яромкіна і Хітровай пачуццёвы і адначасова вытанчаны. А Ор і Ора — Трэнкіна і Шуба, падаецца, яшчэ імгненне — і ўзнімуцца над сцэнай: такія лёгкія іх рухі. Яны і ўзнімуцца разам з абранымі сярод людзей любімцамі. Паводле сюжэта, агрэсіўны натоўп разарве Жанчыну. І Мужчына ў стане роспачы не захоча жыць без яе... Сустрэнуцца яны ўжо на Нябёсах.

Як захаваць каханне ва ўзаемаадносінах тут, на Зямлі, і адначасова хоць што-небудзь зрабіць для таго, каб свет стаў лепшы? Як супрацьстаяць неўсвядомленасці, злу? Ці магчыма гэта наогул? І на гэтыя вечныя тэмы мовай танца разважае тэатр.

Фінал балета тужлівы, але светлы. Мноства белых птушак танцуюць свой белы танец кахання. І, па-мойму, ён дорыць нам усім успамін пра тую іскру боскасці, якая ў нас ёсць і абуджае надзею: калі-небудзь усе мы — жыхары Зямлі — станем лепшымі.

Валянціна **Ждановіч**

# Энергія, экспрэсія, сімволіка і ... сны Марка Шагала

**7 ліпеня споўнілася 130 гадоў з дня нараджэння аднаго з самых славутых мастакоў дваццатага стагоддзя, нашага земляка Марка Шагала. Да гэтай знамянальнай даты Нацыянальны мастацкі музей Рэспублікі Беларусь і Музей Марка Шагала ў Віцебску падрыхтавалі выставу "Марк Шагал: Колер Кахання". Выстава будзе экспанавацца ў Мінску — у Нацыянальным мастацкім музеі — да сярэдзіны верасня гэтага года.**

Марк Шагал па праву лічыцца адным з самых славутых майстроў XX стагоддзя. Творчасць мастака адрозніваецца незвычайнай рознабаковасцю: ён і рысавальшчык, і гравёр, і жывапісец, і сцэнограф, і ілюстратар, і аўтар твораў манументальных і прыкладных відаў мастацтва. Пры ўсёй разнастайнасці творчых інтарэсаў і сюжэтных тэм у творчасці Марка Шагала выразна прасочваецца галоўная лінія — любоў, пра якую мастак не стамляўся гаварыць да самай смерці. Любоў зямная і нябесная для яго некалькі дзесяцігоддзяў атаясамлівалася з рэальным вобразам жонкі Бэлы, якая ў творах мастака была ўвасабленнем Музы, Нявесты, Жонкі, Прыгожай Дамы. Але была і любоў да Радзімы, роднага Віцебска, любоў да Парыжа і Францыі, фантастычная любоў да літаратуры…



Шырока вядомыя пранікнёныя ілюстрацыі Марка Шагала да аўтабіяграфічнай кнігі "Маё жыццё" і да кніг Бэлы ("Гарачыя агні", "Першая сустрэча", "Мае сшыткі"); вострыя па сваіх характарыстыках і назіраннях ілюстрацыі да "Мёртвых душ" Гогаля; ілюстрацыі да "Баек" Лафантэна, якія адрозніваюцца непаўторнай разнастайнасцю вобразаў і колеравых рашэнняў; насычаныя колерам ілюстрацыі да рамана старажытнагрэчаскага пісьменніка Лонга "Дафніс і Хлоя"; нарэшце, ілюстрацыі да "самай вялікай крыніцы паэзіі ўсіх часоў" — Бібліі. "Я заўсёды марыў працаваць над кнігамі", — пісаў Марк Шагал і паслядоўна рэалізоўваў гэтую мару на працягу ўсяго свайго творчага жыцця.

Выстава "Марк Шагал: Колер Любві" таксама звязана з Кнігай. Прадстаўленыя ў экспазіцыі літаграфіі былі выкананы Маркам Шагалам пераважна ў 1950-1960-я гады як ілюстрацыі да розных выданняў, але выданняў, прысвечаных самому Шагалу. Мастак выконвае ілюстрацыі да тэкстаў пра сябе, "ілюструе" самога сябе. Адсюль увесь найбагацейшы шэраг сюжэтных тэм, што адрознівае творчасць Шагала: пейзажы Віцебска, Парыжа, закаханыя



пары, маці і дзіця, фантастычныя істоты і сімвалічныя жывёлы, музыканты і, вядома, вобраз самога майстра.

У 1957 годзе ў парыжскім выданні Эме Мага выйшла ў свет манаграфія "Шагал" вядомага французкага мастацкага крытыка і гісторыка мастацтва Жака Ласеня, з якім мастака звязвала шматгадовае сяброўства. Акрамя тэксту, фатаграфій і рэпрадукцый твораў Шагала, кніга ўключала 13 каляровых і 2 чорна-белыя літаграфіі, выкананыя мастаком у знакамітай парыжскай друкарскай майстэрні Фернана Мурло. З іх ліку на выставе прадстаўлены адзінаццаць каляровых і адна чорна-белая ("Вёска") літаграфіі.

У 1965 годзе Жак Ласень апублікаваў кнігу "Плафон Парыжскай оперы", прысвечаную гісторыі стварэння і апісанню роспісу, над якім Марк Шагал працаваў у 1963-1964 гадах. Урачыстае адкрыццё новага плафона Гранд-Апера адбылося ў верасні 1964 года. Спецыяльна для гэтага багата ілюстраванага выдання мастак стварыў арыгінальную літаграфію, якая прадстаўляе адзін з фрагментаў роспісу плафона. Акрамя літаграфіі Шагала і вялікай колькасці фотаілюстрацый, кнігу дапаўнялі шэсць літаграфій, выкананых Шарлем Сарльерам па творах мастака.

"Мне падаецца, што мне чагосьці не хапала, калі б я … не заняўся ў пэўны момант жыцця гравюрай і літаграфіяй. Калі я браў у рукі літаграфскі камень ці медную дошку, мне падавалася, што ў мяне ў руках талісман. Мне падавалася, што я змагу змясціць на іх усе мае радасці і смутак. Усё, што напаўняла маё жыццё, — нараджэнне, вяселлі, смерці, кветкі, жывёл, птушак, бедных рабочых, бацькоў, закаханых у ночы,



біблейскіх пракокаў на вуліцы, у храме і на небе…" — пісаў Марк Шагал. За сваю ўражлівую кар'еру мастак стварыў шматлікія графічныя творы — малюнкі, афорты, літаграфіі, тым самым даказаўшы, што ён не толькі вялікі мастак-каларыст, але і майстар лініі ды танальных адносін.

Графічная спадчына Шагала надзвычай вялікая. У 1960 годзе ў выдавецтве Андрэ Сарэ ў Монтэ-Карла (існавала ў 1946-1980-х гадах) была апублікавана першая частка шасцітомнай працы — каталога "Шагал. Літаграфіі" (апошні том выйшаў у свет у 1986 годзе). Для гэтага выдання, якое змяшчае тэкст на французкай і нямецкай мовах, Шагал выканаў 21 каляровую і 7 чорна-белых літаграфій. У экспазіцыі прадстаўлены тры літаграфіі да першага тома — "Аўтапартрэт", "Бухта анёлаў", "Прывід Парыжа" — і дзве да другога (1963) — "Неба закаханых" і "Накцюрн Ванса".

На выставе ў Мінску экспануюцца літаграфіі, створаныя Шагалам спецыяльна для часопісаў "Derrière le miroir" ("Дэр'ер ле міруар", "Па той бок люстэрка") і "Verve" ("Верв", "Натхненне"), якія валодалі эксклюзіўным правам на публікацыю арыгінальных гравюр у сваіх нума-

рах. “Derrière le miroir”, заснаваны парыжскім калекцыянерам, галерыстам і выдаўцом Эме Магам у 1946 годзе (першы нумар выйшаў у свет у кастрычніку 1946 года), стаў адным з найбуйнейшых выданняў, чые публікацыі працягваліся аж да 1982 года. За гэты час было апублікавана 253 нумары часопіса. № 99-100 за ліпень-жнівень 1957 года быў прымеркаваны да выставы Марка Шагала ў галерэі Маг. Аўтарам тэксту да выдання стаў вядомы французкі пісьменнік і эсэіст Жан Палан. Для гэтага нумара мастак выканаў тры чорна-белыя і чатыры каляровыя літаграфіі, з якіх дзве — “Канцэрт” і “Мастак і яго двайнік” — прадстаўлены на выставе.

З выдавецтвам “Verve” франка-грэчаскага мастацкага крытыка і калекцыянера Эжэна Тэрыяда Шагала звязвалі шматгадовае сяброўства і плённае супрацоўніцтва. Часопіс “Verve” выдаваўся са снежня 1937 па 1960 год. За гэты перыяд было апублікавана 38 нумароў у 10 тамах. Да № 24 (1950) Шагал выканаў вокладку, у №№ 27-28 (1952) былі апублікаваны яго восем літаграфій, з ліку якіх тры (“Плошча Згоды”, “Маці і дзіця перад Нотр-Дам” і “Бачанне Парыжа”) экспануюцца цяпер на выставе ў Мінску. У №№ 33-34 (1956) і 37-38 (1960) “Verve” была апублікавана знакамітая “Біблія” Шагала, якая стала сапраўды вяршыняй творчасці мастака.

“У мастацтве, як у жыцці, усё магчыма, калі ў аснове ляжыць любоў”, — гаварыў Марк Шагал. Ён быў мастаком-гуманістам, які не толькі любіў жыццё ва ўсіх яго праявах, але і трансфармаваў гэтую любоў у свае творы, яркімі фарбамі ўслаўляючы любоў як чароўны дар.



Выстава “Марк Шагал: Колер Любві” працягвае традыцыю знаёмства з творчасцю вялікага майстра ў сценах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі.

У 1997 годзе адбылася першая сустрэча беларускага гледача з мастацтвам Марка Шагала, калі нашчадкі мастака — яго ўнучкі Бэла і Мерэт Меер, арганізатары экспазіцый Шагала ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь і Музеі Марка Шагала ў Віцебску, прапанавалі адзначаць дзень нараджэння майстра ў Беларусі выставамі яго твораў. Гэтая традыцыя захоўвалася на працягу некалькіх гадоў — да 2005 года. Услед за выставай “Марк Шагал. Творы міжземнаморскага перыяду. Гуашы, акварэлі, літаграфіі. 1949-1985” былі наладжаны і іншыя: “Марк Шагал. Прысвячэнне Парыжу” (2000), “Марк Шагал. Пейзажы” (2002), “Марк



# Вытокі неверагоднай тугі па малой радзіме

**Віцебск адзначыў 130-годдзе Марка Шагала перформансамі і выставамі**

Святкаванні юбілею пачаліся яшчэ ў студзені. Спачатку адкрылася выстава, прысвечаная нямецкаму мастаку Герману Штруку, у якога ў 1922 годзе Шагал вучыўся мастацтву гравюры. Потым адбылася прэзентацыя IV Шагалаўскага зборніка. Напярэдадні майскіх святаў у Арт-цэнтры пачала працаваць выстава “130 гадоў — 130 шэдэўраў. Рэтраспектыва творчасці Марка Шагала са збору музея”. Затым адбылася прэзентацыя арт-праекта Віктара Барысенкава, які ў сваіх работах пры дапамозе сумяшчэння фатаграфій, зробленых



музеі, адзначыў тады, што, гаворачы пра французкага Шагала, аднаго з самых цікавых і вядомых мастакоў 20-га стагоддзя, які многія гады жыў і тварыў у Францыі, французы не забываюць, што ён нарадзіўся на беларускай зямлі. Французкі пасол звярнуў увагу, што, так, Беларусь была зямлёй Марка Шагала, але яшчэ некалькі гадоў назад яна была без Шагала — без яго работ. А цяпер можна бачыць, як развіваецца ўплыў і дух вялікага мастака ў Беларусі. Мішэль Рэнеры падзякаваў тады ўсім, хто змог прыцягнуць спонсараў, каб больш і больш паказваць Марка Шагала на радзіме мастака. Гэта, безумоўна, новы этап і новы крок у культурным жыцці Беларусі, адзначыў тады французкі пасол.

Шагал і сцэна" (2004). У 2005 годзе ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі (з 2009 года — Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусь) адбылася выстава "Марк Шагал. Колер у чорна-белым". Літаграфіі Марка Шагала былі прадстаўлены ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь на выставе "Марк Шагал і мастакі еўрапейскага авангарду" з калекцыі Музея Марка Шагала ў Віцебску, якая адбылася ў 2010 годзе. У лістападзе 2012 — студзені 2013 года ў музеі экспанавалася выстава "Марк Шагал: жыццё і каханне" з калекцыі Музея Ізраіля.

Выстава, якая была арганізавана Музеем Ізраіля па ініцыятыве і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства культуры Беларусі, пры падтрымцы беларускага пасольства ў Іерусаліме ды ізраільскага — у Мінску, стала яркай падзеяй, якая завяршала юбілейны 125-ы год з дня нараджэння сусветна вядомага мастака. Помніцца, пасол Францыі ў Мінску Мішэль Рэнеры, выступаючы на прэзентацыі выставы ў Нацыянальным мастацкім

Што ж, цалкам справядліва і аб'ектыўна. Дарэчы, калі размова зайшла пра Францыю, то, сапраўды, да месца будзе ўспомніць пра той час, калі ў Парыжы жыў і тварыў Шагал. У 20-х гадах мінулага стагоддзя ў французкую сталіцу прыязджала вялікае мноства мастакоў з Еўропы і Амерыкі, якія здымалі майстэрні на Манпарнасе. Падчас адпачынку яны збіраліся ў кафэ, удзельнічалі ў тэматычных балях, падтрымліваючы тым самым рэнамэ Парыжа як самага артыстычнага горада, дзе ёсць месца самым вар'яцкім задумам і ўсё настройвае на творчасць. Сярод "прыстанішча галечы і натхнення" тых часоў асаблівае месца займаў "Вулей" — камуна-інтэрнат мастакоў з розных краін. Гэты ўнікальны цэнтр паслу-

з інтэрвалам у стагоддзе, паказаў, як змяніліся шагалаўскія месцы. А нядаўна змянілася і вуліца Пакроўская, на якой размешчаны Дом-музей Шагала. На агароджах і фасадах з'явіліся паэтычныя і празаічныя цытаты мастака, якія, з аднаго боку, служаць арт-аб'ектам, а з другога — прымушаюць паглядзець на Віцебск па-новаму ў спробе зразумець вытокі неверагоднай любві і смутку мастака па малой радзіме.

Прэзентацыя роспісу з паэтычным прысвячэннем Шагала "Да майго горада Віцебска" стала часткай юбілейных мерапрыемстваў. Нацыянальны акадэмічны драмтэатр імя Якуба Коласа паказаў спектакль "Шагал. Шагал..." — вядомую пастаноўку Віталя Баркоўскага, якая атрымала некалькі прэстыжных прэмій на міжнародных фестывалях. Урачыстасці разгарнуліся на вуліцы Пакроўскай, дзе пасля ўскладання кветак да помніка Шагалу прайшло тэатралізаванае шэсце. Уся вуліца нібы ажыла: былі і музыканты, і мастакі, і танцоры, і акрабаты. Марк і Бэла праехалі ў брычцы да самага дома-музея, у двары якога пачыналася свята-гулянне. Калектыў "Шалом" з Ліды наладзіў канцэрт вулічнай яўрэйскай музыкі. А крыху пазней на гэтай жа пляцоўцы ўпершыню пад адкрытым небам быў паказаны спектакль "Шагал. Зыход" Беларускага тэатра "Лялька". І яшчэ адно незвычайнае дзейства адбылося на тэрыторыі культурна-гістарычнага комплексу "Залатое кальцо горада Віцебска "Дзвіна". Гасцей, якія прыйшлі ўвечары, чакаў арт-перформанс "Васільковае неба": атмасфера пачатку ХХ стагоддзя, ажыўшыя карціны Шагала — ад скрыпачоў на даху да закаханых над горадам…



жыў прыстанкам вядомым майстрам Парыжскай школы, такім выхадцам з Беларусі, як Цадкін, Кікоін, Суцін, Архіпенка, Крэмень. У тым ліку і Шагалу. Намеры стваральніка "Вулея" Альфрэда Бушэ не абмяжоўваліся прадастаўленнем мастакам жылля. Ён назначыў смехатворную плату: пяцьдзясят франкаў за майстэрню на паверсе ці за домік. "І да таго ж, — успамінаў Шагал, — плаціць ніхто не абавязваў!" Галоўнай мэтай Бушэ з'яўлялася стварэнне сапраўднага культурнага цэнтра, такога, якім мы яго сёння ўяўляем.

Шагал часта ўспамінаў тыя шчаслівыя дні, што ён правёў у "Вулеі". "Манпарнаскае жыццё — гэта цудоўна! — гаварыў ён. — Я працаваў ночы напралёт... У суседняй майстэрні рыдала пакрыўджаная натуршчыца, у італьянцаў спявалі пад мандаліну, Суцін вяртаўся з рынку з грудай нясвежых куранят, каб маляваць іх, а я сядзеў адзін у сваёй драўлянай келлі перад мальбертам, пры святле няшчаснай газавай лямпы...".

Калі творы нараджаліся ў майстэрнях, то ў парыжскім кафэ "Ратонда", дзе збіраліся нястрымныя мастакі і дзяліліся сваімі надзеямі, выношваліся ідэі і складваліся пэўныя эстэтычныя погляды. Зноў жа з успамінаў Шагала: "Увечары гэты пакой запаўняўся, стаяў крык: спрачаліся пра жывапіс, дэкламавалі вершы, абмяркоўвалі, дзе дастаць пяць франкаў, сварыліся, мірыліся...".

Так, выстава "Марк Шагал: жыццё і каханне" прадоўжыла традыцыю знаёмства з творчасцю вялікага майстра — у сценах Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі. Сярод прадстаўленых тады твораў былі работы, падараныя Музею Ізраіля самім мастаком, яго дачкой Ідай Шагал, а таксама работы, якія паступілі ў дар ад шматлікіх прыватных калекцыянераў з Еўропы, Амерыкі ды Ізраіля.



Пазней творы Марка Шагала — з карпаратыўнай калекцыі ААТ "Белгазпрамбанк" і Музея Марка Шагала ў Віцебску — былі прадстаўлены ў 2012 годзе ў Мінску на выставе "Мастакі Парыжскай школы з Беларусі". Тады ж па рашэнні акцыянераў Белгазпрамбанка ў дар Нацыянальнаму мастацкаму музею былі перададзены два графічныя аркушы мастака. У 2014 годзе работы Шагала з калекцыі Белгазпрамбанка ізноў былі прадстаўлены ў складзе экспазіцыі "Дзесяць стагоддзяў мастацтва Беларусі". А ў маі 2017 года — на выставе "Даторы, Шагал, Суцін, Хадасевіч-Лежэ. Энергія, экспрэсія, сімволіка і сны. Погляд на мастацтва Італіі першай паловы XX стагоддзя". Такім чынам, беларускі глядач атрымаў унікальную магчымасць паступова знаёміцца са шматграннай творчай спадчынай знакамітага суайчынніка.

Веніямін **Міхееў**



“Бухта анёлаў”. 1960

# НОВАЯ АДМЕТНАСЦЬ




## Часопіс для тых, хто жадае ведаць больш